

НАЦЫЯНАЛЬНАМУ МАСТАЦКАМУ — 80! 8

ЖАЛЕЗНАЯ ЛЭДЗІ З ВІЦЕБСКА 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 17 (28884)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Папулярызацыя масавых відаў спорту стымулюе кожнага да здаровага ладу жыцця. Клопат аб уласным здароўі чалавека з'яўляецца важным складнікам у жыцці грамадства. У нашай дзяржаве гэтаму ўдзяляецца вялікая ўвага: будуюцца новыя аб'екты, развіваецца спартыўная інфраструктура, паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база спартыўных установ. Цяпер, у зімовых умовах, трэба забяспечыць на кожным стадыёне заняткі лыжным спортам, павінны быць заліты ўсе хакейныя пляцоўкі, арганізаваны пракат канькоў і іншага спартыўнага інвентару».

КАРАТКА

• З 1 лютага 2019 года памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў складзе: на першае дзіця — Br362,46 (35 працэнтаў ад сярэднямесячнай зарплаты работнікаў у краіне), на другое і наступных дзяцей — Br414,24 (40 працэнтаў), на дзіця-інваліда — Br466,02 (45 працэнтаў).

• **У Віцебску тэсціруюць тэхніку МТЗ для катковў і лыжных трас.**



• У Астраўцы ў студзені ўведзена ў строй новая падстанцыя «Юбілейная», якая стала першай лічбавай падстанцыяй у беларускай энергасістэме.

• **Нацыянальны аэрапорт Мінск ўкараніў у сектары прылёту сістэму размежавання пасажыраў. Асобныя каналы афармлення загадзя вылучаюцца для грамадзян Саюзнай дзяржавы або для грамадзян іншых краін.**

ISSN 1990 - 763X

ВУЧОНЫЯ АТРЫМАЛІ ПРЫЗНАННЕ І НОВЫЯ ЗАДАЧЫ

Учора ў Палацы Незалежнасці кіраўнік дзяржавы ўручыў дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам.

Да новых дасягненняў

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з усяго комплексу мерапрыемстваў ён заўсёды чакае сустрэч з людзьмі са свету навукі. На яго думку, навука адыгрывае важную ролю ў жыцці любой дзяржавы, забяспечвае яе незалежнасць і палітычную вагу на міжнароднай арэне.

«Таму, уручаючы напярэдадні прафесійнага свята дактарам і прафесарам заслужаныя дыпломы і атэстаты, мы не толькі адзначаем вынікі аўтарскіх даследаванняў, але перш за ўсё ставім перад айчыннымі навукоўцамі новыя канцэптуальныя стратэгічныя задачы, — сказаў ён. — Вы, як ніхто, ведаеце, што межы навукі недасягальныя. І кожнае новае пакаленне навукоўцаў заўсёды імкнецца пайсці далей за тую вяршыню, якую ўжо пераадолелі першаадкрывальнікі».

СТАР. 2

Аляксандр ЛУКАШЭНКА ўручае атэстат прафесара рэктару БДУ Андрэю КАРАЛЮ.

Фота БелТА.

У НАВУЦЫ — ЯК У СПОРЦЕ: ТОЛЬКІ НАПЕРАД

Аляксандра ЦЯСЁЛКІНА — асістэнт кафедры агульнай і клінічнай фармакалогіі факультэта падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў Віцебскага медуніверсітэта. Распараджэннем кіраўніка дзяржавы ёй прызначана стыпендыя на 2019 год. Маладая даследчыца займаецца распрацоўкамі ў галіне фармакалогіі і праводзіць заняткі са студэнтамі.

Фота БелТА.

Уласныя фінансы

ЧАС ПАДАВАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ

Падлічыць леташнія даходы трэба будзе на месяц пазней звычайнага

Сёлета дэкларацыю аб даходах за мінулы год трэба падаць у тэрмін не пазней за 1 красавіка. Хто абавязаны наведаць падатковую інспекцыю? «Звязда» сумесна са спецыялістамі Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі падрыхтавала падрабязны тлумачальнік.

АЎТОБУС ЦІ ДРУГІ «ЛЕГКАВІК»

Дэкларацыя можа быць прадстаўлена ў пісьмовай форме ў падатковы орган незалежна ад месца пастаноўкі на ўлік або ў электронным выглядзе праз асабісты кабінет плацельшчыка.

Да другога месяца вясны абавязкова падаць дэкларацыю павінны тыя, хто за мінулы год прадаў больш за адзін аўтамабіль, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога складае да 3500 кілаграмаў і колькасць сядзячых месцаў у ім, акрамя сядзення кіроўцы, — да васьмі. Абавязак на дэклараванне пачынаецца пасля продажу аднаго грузавога аўтамабіля або аўтобуса, калі ў першага агульная маса перавышае 3500 кілаграмаў, а ў другога колькасць месцаў перавышае восем. Тут спецыялісты МПЗ удакладнілі, што, калі машына, якую вы прадалі, дасталася вам у спадчыну, падатак плаціць не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння транспартных сродкаў на працягу каляндарнага года.

ЛІЧЫМ КВАТЭРЫ ЗА ПЯЦЬ ГАДОЎ

Запаўняць дэкларацыю па выніках года павінны і тыя, хто на працягу пяці апошніх гадоў прадаў іншым фізічным асобам другую кватэру ці другі жылы дом, больш як адзін садовы домік, больш чым адзін гараж (зямельны ўчастак, машына-месца), якія належаць чалавеку на праве ўласнасці.

Але пры продажы на працягу 2013—2018 гадоў аднаго наймення аб'екта нерухомасці (напрыклад, у 2015-м — кватэры, а ў 2018-м — жылога дома) фізічнай асобе не трэба падаваць дэкларацыю (разлік), бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

СТАР. 3

У НАВУЦЫ — ЯК У СПОРЦЕ: ТОЛЬКІ НАПЕРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў Прэзідэнта, у навуцы — як у спорце: трэба толькі наперад, быць хутчэйшым, дакладнейшым і мацнейшым за тых, хто ўжо паказаў чарговы рэкорд. Пры гэтым на дыстанцыі да сваёй мэты дапамагаюць не толькі прафесійныя навыкі, але і характар, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Гэтаксама навуковы поспех і прызнанне прыходзяць да моцных асоб. Таленавітых, упартых у працы і бясконца адданых сваёй справе.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, безумоўна, усе дасягненні прысутных на цырымоніі — гэта вынікі шматгадовай, часам ювелірнай працы. Вынікі шчырага імкнення служыць людзям, павышаць якасць жыцця сваіх сучаснікаў і змяняць да лепшага жыццё будучых пакаленняў. Ён дадаў, што мэты навуцы ставіць сам час.

«І сёння нам асабліва патрэбныя веды і вопыт ужо вядомых, тытулаваных навукоўцаў, энергія і амбіцыі маладых даследчыкаў, якія падаюць надзеі, гатовых не толькі пакараць нязведаныя сілы прыроды, але і супрацьстаяць разам з дзяржавай найскладанейшым палітычным і эканамічным выклікам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што чакае ад людзей навукі інавацыйных праектаў і тэхналогій у галіне атамнай энергетыкі, асваення касмічнай прасторы і лічбавізацыі. У галінах эканомікі, медыцыны і адукацыі, а таксама ў сферах сацыялогіі, экалогіі і геалогіі. «Інтэлектуальная праца — гэта аснова развіцця любога грамадства. І яна павінна быць прыдатнай у жыцці, накіраванай на канкрэтны вынік, мусіць прынесці рэальную карысць дзяржаве і людзям», — канстатаваў ён.

Што датычыцца падтрымкі перспектыўных спецыялістаў, то на цяперашнім этапе ў краіне зроблена многае. Створаны аптымальныя ўмовы для навукова-тэхнічнай і практычнай дзейнасці, распрацавана сістэма матэрыяльнага заахвочвання за эфектыўнае ўкараненне ідэй у рэальны сектар і сацыяльную сферу.

Змяніць свет да лепшага

На думку Прэзідэнта, ва ўсе часы навуцы было цесна ў рамках дзяржаўных і геапалітычных межаў. Яна нязменна належыць усяму чалавецтву, закліканая служыць на карысць цывілізацыі. «Гэта значыць, ваш адвечны тэзіс — навука інтэрнацыянальная. І вам, беларускім навукоўцам, як і ўсёй сусветнай навуковай супольнасці, трэба будзе яшчэ нямала зрабіць, каб адказаць на беспрэцэдэнтныя па складанасці і шматмернасці сучасныя выклікі», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы мяркуе, што сёння неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на пошук альтэрнатыўных крыніц энергіі, спыніць незваротныя экалагічныя змены, адкрыць новыя спосабы прафілактыкі невылечных хвароб і барацьбы з імі, пераадолець харчовыя крызісы і вырашыць многія іншыя праблемы, актуальныя для ўсіх жыхароў планеты.

Пры гэтым у маштабах краіны трэба разам працаваць перш за ўсё на дасягненне дзяржаўных стратэгічных мэт. Павышаць канкурэнтаздольнасць айчыннай эканомікі, гарантаваць нацыянальную бяспеку Беларусі, умацоўваць наш суверэнітэт.

«І змяняць увесь свет да лепшага, падымаць чалавецтва на новую ступень развіцця. Таму што там, дзе высока стаіць навука, высока будзе стаяць чалавек», — дадаў ён.

Прэзідэнт пажадаў прысутным заўсёды быць на вышыні ў такім нялёгкім, але бясконца займальным навуковым пошуку, а таксама павіншаваў усіх нашых навукоўцаў з Днём беларускай навукі. «Няхай гэтая сустрэча стане крыніцай творчага натхнення на працу ў імя працвітання Беларусі, у імя міру на Зямлі», — сказаў беларускі лідар. Пасля гэтага пачалася цырымонія ўручэння.

Дыпломы доктара навук атрымалі Сяргей Байко, Аляксандр Дзядзько, Людміла Макарына-Кібак, Сяргей Палякоў, Алег Баранаў, Аляксандр Бараноўскі, Ганна Крывашэева, Людміла Маханько, Віктар Астрога, Аляксей Палякоў, Сяргей Ровін і Сяргей Хахомаў.

Атэстатаў прафесара ўдастоіліся Таццяна Дасаева, Антаніна Яфіменка, Эмілія Каламіец, Наталля Канапля, Андрэй Кароль, Наталля Шакавец і Ганна Яравая.

Далей Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да прысутных і заклікаў выказацца, калі ў кагосьці ёсць пытанні і прапановы па той ці іншай галіне.

Пра другасную сыравіну і пластык

Падчас дыскусіі Прэзідэнта з навукоўцамі была ўзнятая тэма рэсурсазберажэння, другаснай перапрацоўкі адходаў. Беларускі лідар адзначыў, што гэта вельмі важная праблема для нашай краіны. У практыцы невялікіх дзяржаў, напрыклад у Швейцарыі, 100 % шклатары вырабляецца з другаснай сыравіны. Гэта значыць, яны паспяхова збіраюць выкарыстаныя бутэлькі, а потым з іх жа вырабляюць шкло. «А ў нас? Мы, бачыце, багатыя — мы проста расхлябаныя і разбэшчаныя, як у Беларусі кажуць. Таму Адміністрацыі Прэзідэнта даручана самым жорсткім чынам кантраляваць гэта — адходы, макулатуру, жалеза, металічныя вырабы рознага роду, пластык і іншае, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта трэба ўсё збіраць і перапрацоўваць. Усюды павінен быць парадак».

Развітыя краіны, якія клапоцяцца пра сваіх грамадзян, адмаўляюцца ад пластыку. «Я нядаўна даручыў: трэба прыбраць пластыкавыя бутэлькі і тару на першым этапе. І замяніць шклом. Тым больш у нас гэтая сфера прамысловасці высокаразвітая», — падкрэсліў ён.

Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу: гэта не трэба «адпрацоўваць», гэта трэба рэалізаваць.

Пра хабар медыкам і глухаватасць чыноўнікаў

Паколькі ў зале прысутнічала нямала спецыялістаў з медыцынскай сферы, удзельнікі дыскусіі закранулі і гэтую тэму.

Звяртаючыся да старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людмілы Макарынай-Кібак, Аляксандр Лукашэнка спытаў аб карупцыйнай сітуацыі ў Міністэрстве аховы здароўя. Старшыня камісіі выказала ўпэўненасць, што сёння ў ведамстве перагледзелі падыходы да закупак абсталявання і іншых аспектаў іх дзейнасці.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў звярнуць увагу парламенцкай камісіі, якую ўзначальвае Макарына-Кібак, менавіта на гэты важны кірунак. «Гэта няправільна, калі на святой справе людзі набіваюць кішэні, — падкрэсліў ён. — Закупляючы невядома як лекавыя прэпараты, павялічваючы іх кошт мінімум на чвэрць, а то і на траціну. І медыцынскае абсталяванне — вы ведаеце, пра што ідзе гаворка, ды і ўсё наша грамадства ведае. Дараванне ўрачам тут не будзе».

Таксама Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці ёсць у гэтай сферы вельмі якасныя спецыялісты-оталарынголагі, святілы навукі, каб нашы людзі не ехалі лячыцца за мяжу. Адказ быў станоўчы. «Добра, прыеду да цябе — маё вуха, адно і другое, паглядзіш. А потым усіх начальнікаў даследуем, таму што не ўсё нармальна чуюць, калі ім распараджэнні аддаеш, даводзіш задачы», — пажартаваў кіраўнік дзяржавы.

Пра кадры для ІТ і праблему жука-караеда

Гаварылі і пра ўніверсітэты, у прыватнасці, павелічэнне набору студэнтаў для наступнай працы ў ІТ. Паводле слоў Прэзідэнта, у выпадку недахопу кадраў трэба даць магчымасці для навучання — тым больш што гэта гатовы прафінансаваць будучыя працадаўцы.

Пасля да кіраўніка дзяржавы звярнуўся загадчык сектара геномных даследаванняў лабараторыі генетыкі і біятэхналогіі Інстытута лесу НАН Беларусі Алег Баранаў і распавёў пра сітуацыю ў сваёй сферы. У яго Прэзідэнт спытаў, ці з'яўляецца для нас выклікам жук-караед. Спецыяліст адзначыў, што гэтая праблема звязана як з прыроднымі ўмовамі, так і з пралікамі ў вядзенні лясной гаспадаркі пасля вайны. Тым не менш цяпер гэтыя памылкі выпраўляюцца. Апошнія даследаванні паказалі, што інтэнсіўнасць узнікнення караедных ачагоў пайшла на спад.

Яшчэ Прэзідэнт заклікаў навукоўцаў займацца даследаваннямі, важнымі для чалавека і дзяржавы, для нашай эканомікі. Гэта датычыцца і навуковых работ — павінна быць не толькі кампіляцыя або агляд розных артыкулаў. Забываць аб фундаментальных даследаваннях пры гэтым не варта.

Пра электрыфікацыю нашай краіны

У працяг тэмы неабходных і важных даследаванняў Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму ўводу атамнай электрастанцыі, мадэрнізацыі цяперашняй энергетычнай сістэмы краіны. Вядома, што з уводам атамнай электрастанцыі прафіцыт электрычнай энергіі будзе каласальны. Кіраўнік дзяржавы заклікаў не арыентавацца толькі на продаж лішкаў за мяжу, а паспрабаваць забяспечыць наша насельніцтва (напрыклад, тымі ж энергаэфектыўнымі бытавымі плітамі і прыборамі).

У той жа час можна перасадзіць насельніцтва на электрамабілі — Акадэміі навук была пастаўлена задача распрацаваць розны транспарт: ад электравеласіпедаў да трактароў. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта павінны быць нашы распрацоўкі, а не прывезенае з-за мяжы абсталяванне. Перш за ўсё гаворка пра назапашвальныя батарэі.

Па словах старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Гусакова, распрацоўваецца цэлы шэраг электратранспарту — ровар, скутар, матацыкл. Дапрацоўваецца электрамабіль, зроблены электрамінівэн, машына для камунальных патрэб, невялікі грузавічок. Ён выказаў гатоўнасць прадэманстраваць гэтыя распрацоўкі. Стаіць задача, каб да канца года былі створаны невялікія вытворчасці. Дарэчы, яшчэ Акадэмія навук распрацавала сваю батарэю-назапашвальнік, якая ўжо ўкараняецца ў айчынныя ўзоры электратранспарту.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на кампанію Tesla і адзначыў, што наш электрамабіль павінен быць блізкі да гэтага і каб беларускія грамадзяне па прынцыпе «кошт — якасць» маглі яго набыць.

«Я ўвогуле аматар аўтатранспарту, — адзначыў ён. — Гэта для мяне хобі такое. І я на многіх аўтамабілях перамяшчаўся, але электрамабіль, нават гэтая Tesla, якую таксама крытыкуюць па многіх рэчах, — гэта цуд-аўтамабіль. Ён вёрткі, хуткасць развівае шалёную».

Прэзідэнт канстатаваў, што электрамабілі — гэта не будучыня, а сучаснасць нашай планеты, таму адставаць нельга. Ён дадаў, што да канца года паглядзіць, на што беларускія распрацоўшчыкі выйшлі ў выніку. Калі асобныя прадпрыемствы працуюць над камплектуючымі для нашых узораў — добра, але трэба ісці далей. Неабходна вызначыцца, дзе размясціць вытворчасць электрамабіляў. Адзін з варыянтаў — Geely.

Па словах Гусакова, у параўнанні з тым электрамабілем, які ўжо быў прадэманстраваны, магутнасць цяперашняга вырасла ў некалькі разоў.

Беларускі лідар спытаў, ці зможа ён праехаць на такім аўто 500 кіламетраў без падзарадкі. Уладзімір Гусакоў адказаў, што пакуль ёмістасці акумулятара хопіць на 200—250 кіламетраў, але зробяць і на 500.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

(Працяг тэмы навукі — на 7-й стар.)

Дзеячам навукі, работнікам навукова-даследчых інстытутаў і ўстаноў вышэйшай адукацыі

Дарагія сябры!

Віншую вас з прафесійным святам — Днём беларускай навукі.

Ваша прызванне — быць навукоўцам, весці грамадства па шляху прагрэсу — высокая і адказная місія.

Дзякуючы захаванню традыцый, інавацыйнай актыўнасці беларускіх даследчыкаў наша навука дынамічна развіваецца, прытрымліваючыся стратэгічных мэтаў дзяржавы, спрыяе эканамічнаму росту, умацаванню нацыянальнай бяспекі і суверэнітэту краіны.

Перакананы, што вашы талент і працавітасць, прарыўныя навуковыя распрацоўкі будуць і надалей падтрымліваць міжнародны імідж Беларусі — краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу.

Жадаю вам здароўя, натхнення і паспяховай рэалізацыі ўсіх ідэй і задум на карысць Радзімы і ў імя міру.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

СМІ: Белы дом рыхтуецца ўвесці рэжым надзвычайнай сітуацыі

Белы дом падрыхтаваў праект афіцыйнай заявы прэзідэнта Дональда Трампа аб увядзенні рэжыму надзвычайнай сітуацыі ўздоўж граніцы ЗША з Мексікай і выдзяленні ў абыход Кангрэса $7 млрд на будаўніцтва там фізічнай перашкоды. Пра гэта паведаміла тэлекампанія CNN.

Як нагадвае CNN, прэзідэнт не выключаў магчымасці скарыстацца сваімі паўнамоцтвамі і загадаць пабудаваць сцяну на мяжы з Мексікай, пакуль Кангрэс і Белы дом будуць шукаць кампраміс па пытанні аднаўлення работы федэральнага ўрада і завяршэння шатдаўну. У той жа час адміністрацыя пайшла па альтэрнатыўным шляху, які дазваляе дабіцца жаданай мэты ў абыход заканадаўцаў, тлумачыць тэлекампанія.

У дакуменце сярод іншых выкладаецца варыянт фінансавання сцяны за кошт авансу Міністэрства фінансаў у $681 млн, асігнаванняў па будаўнічай лініі Міністэрства абароны ў памеры $3,6 млрд, фонду інжынерных работ Пентагона ў памеры яшчэ $3 млрд і $200 млн з бюджэту Міністэрства ўнутранай бяспекі.

Грузія зможа прымаць асуджаных Гаагскім трыбуналам злачынцаў для адбыцця пакарання

Адпаведнае пагадненне падпісалі ў Тбілісі Міністэрства юстыцыі Грузіі і Міжнародны крымінальны суд.

«Міністр юстыцыі Грузіі Тэя Цулукіяні і намеснік старшыні Міжнароднага крымінальнага суда Роберт Фрэмр падпісалі пагадненне, якое грунтуецца на сістэме двайной згоды: на першым этапе Грузія выказвае агульную згоду далучыцца да сістэмы выканання прысудаў асуджаных Гаагскім трыбуналам, а на другім этапе ў яе будзе права пагадзіцца ці адмовіцца прымаць канкрэтнага асуджанага на сваёй тэрыторыі», — паведамляе ў пятніцу прэс-служба грузінскага Мінюста. Перагаворы былі пачаты ў 2015 годзе.

Міністэрства тлумачыць, што неабходнасці выкарыстоўваць пенітэцыярныя ўстановы Грузіі для асуджаных Гаагскім трыбуналам пакуль няма.

Злучаныя Штаты могуць вывесці войскі з Афганістана ў абмен на атрыманне гарантый ад талібаў

ЗША вядуць перамовы з радыкальным рухам «Талібан» з нагоды магчымасці выводу амерыканскіх войскаў з Афганістана ў абмен на атрыманне ад талібаў гарантый не хаваць тэрарыстычныя групоўкі на падкантрольнай ім тэрыторыі. Пра гэта паведаміла газета The New York Times.

Па звестках яе крыніц, падобныя абмеркаванні вядуцца ў ходзе кансультацый паміж прадстаўнікамі ЗША і «Талібана», якія праходзяць гэтымі днямі ў Досе. Амерыканскую дэлегацыю ўзначальвае спецпрадстаўнік Дзярждэпартамента па Афганістане Залмай Халілзад.

Як адзначаюць крыніцы газеты, пра якія-небудзь канчатковыя дамоўленасці пакуль не паведамлялася.

Школа актыўнага грамадзяніна

ВАС, ЯК НІДЗЕ, ЧАКАЮЦЬ ДОМА

Старшакласнікі разважалі пра сябе, сваіх равеснікаў і краіну

На адзіны дзень інфармавання пад агульным дэвізам «Школа актыўнага грамадзяніна» ў СШ № 8 Брэста старшакласнікі сабраліся ў актавай зале. Музей у гонар выпускніка школы, першага Героя Беларусі Уладзіміра Карвата, стаў своеасаблівым цэнтрам патрыятычнага выхавання. Але гэтым разам тэма для абмеркавання была больш шырокая. Да таго ж у школу завітала госць — цяжкаатлетка, заслужаны майстар спорту, ганаровы грамадзянін Брэста Ірына КУЛЕША.

У музеі школы.

Тэма агульнарэспубліканскай палітінфармацыі гучала так: «Беларусь сёння: захоўваючы і памнажаючы добрыя традыцыі». Спачатку згадалі рэспубліканскі навагодні баль у Палацы Незалежнасці. Уключылі відэа, дзе кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да моладзі, просіць памятаць юнакоў і дзяўчат: «дзе б яны ні апынуліся па справах работы, вучобы альбо пошукаў сябе, іх ніхто нідзе не будзе чакаць так, як дома».

І дзеці, спачатку нясмела, сталі развіваць гэтую тэму, гаварыць пра свой дом і малую радзіму. Дыскусію ўмела накіроўвала мадэратар — **настаўніца гісторыі Алена КІТЛЕНКА.** Найбольш актыўнічалі дзяўчынкі — яны дзяліліся меркаваннямі аб тым, за якія заслугі трапляюць на рэспубліканскі баль.

Пра спорт гаварылі больш актыўна. Аказалася, у міліцэйскіх класах школы ёсць сапраўдныя аматары хакея. Яны ведаюць амаль на памяць усе каманды як Каляднага турніру, так і спаборніцтваў «Залатая шайба». Загаварылі і аб тым, як спорт збліжае народы. А яшчэ пра тое, як цікава быць балельшчыкам і перажываць эмоцыі ў працэсе гульні.

Ірыне Кулешы задавалі шмат пытанняў. Школьнікаў цікавілі стасункі з роднай школай майстра спорту. Напрыклад, ці ходзіць яна на вечары сустрэчы, ці падтрымлівае сувязь з аднакласнікамі. А калі даведаліся, што муж Ірыны Міхайлаўны — яе школьнае каханне, дзяўчынкі весела азірнуліся на аднакласніка і — наадварот. У канцы сустрэчы адзінацацікласніца Дзіна Загрэба бліскуча правяла для госці экскурсію па музеі Уладзіміра Карвата і запрасіла спартсменку часцей прыходзіць у 8-ю школу.

Намеснік дырэктара школы па выхаваўчай рабоце Жанна ЛАПЫКА пасля мерапрыемства адзначыла, што, на яе здзіўленне, некаторыя з вучняў падчас дыскусіі крыху разгубіліся.

— Але гэта нармальна. Дзеці набываюць вопыт стасункаў у большай аўдыторыі чым клас, — дапоўніла калегу Алена Кітленка. — Цяпер жа асноўная частка іх зносінаў — у сацыяльных сетках, а каб гаварыць ужывую, тым больш перад аўдыторыяй, неабходная пэўная смеласць. Вось для гэтага і патрэбныя падобныя мерапрыемствы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СУБОТНІЯ ЗВАНКІ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца сёння, 26 студзеня, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. З 9.00 да 12.00 іх правядуць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

II Еўрапейскія гульні прызнаны самай значнай кантынентальнай спартыўнай падзеяй 2019 года

Гэта стала вядома па выніках апытання папулярнага рэсурсу Inside the Games. Арганізатары галасавання прапанавалі чытачам сайта на выбар чатыры варыянты: II Еўрапейскія гульні ў Мінску, Афрыканскія гульні ў Рабаце (Марока), Панамерыканскія гульні ў Ліме (Перу) і Ціхаакіянскія гульні ў Апіі (Самоа). Балельшчыкі аддалі 93,45 % галасоў за спартыўны форум у Беларусі.

Inside the Games — інтэрнэт-выданне, якое спецыялізуецца на асвятленні спартыўных падзей і алімпійскага руху.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЧАС ПАДАВАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У адносінах да аб'ектаў камерцыйнай нерухомасці колькаснай падатковай ільготы не існуе. Калі ўласнік прадаў нават адно гандлёвае, офіснае ці адміністрацыйнае памяшканне, ён абавязаны запоўніць дэкларацыю.

Ёсць выключэнне з правілаў. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць машын, дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

ЗАРОБКІ З-ЗА МЯЖЫ

Эксперты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Гэта могуць быць грошы ад працы па найме (кантракце), ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і іншае.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых там (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), залічваюцца пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які трэба заплаціць у Беларусі. Тут існуе адзін нюанс. Такі залік ажыццяўляецца работніку пры ўмове, што ён падасць дакумент аб атрыманым даходзе і ўтрыманым падатку, пацверджаны падатковым ці іншым кампетэнтным органам замежнай краіны.

Такое пацвярджэнне даецца фізічнай асобай альбо ў момант падачы падатковай дэкларацыі, альбо на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падатку, які быў аплачаны ў бюджэт замежнай дзяржавы.

ЛІЧЫМ ПАДАРУНКІ

Падлічваць за год трэба і тыя прыбыткі, якія былі атрыманы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут без варыянтаў. Іншая справа — падарункі.

Калі чалавек летась атрымліваў даходы ў выглядзе дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры больш за 6116 рублёў ад усіх крыніц на працягу года, тады без дэкларацыі яму не абысціся. Падаткаабкладанню падлягае сума менавіта такога перавышэння. Пры гэтым падлічваецца кошт не толькі грашовых падарункаў, але і падараванай маёмасці, уключаючы нерухомасць.

Выключэнне складаюць падарункі сваякоў. Яны вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

Асобамі, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, лічацца бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удачараныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, прадзед, прабабуля, праўнукі, муж і жонка. У адносінах сваяцтва будуць блізкія сваякі мужа ці жонкі, уключаючы памерлых.

ДАХОД АД АРЭНДЫ ЖЫЛЛЯ

Гэта датычыцца тых кліентаў інспекцый, хто ў мінулым годзе здаваў сваю ўласную кватэру на працяглы тэрмін і плаціў фіксаваны падатак. Цяпер яны павінны падлічыць даход ад здачы ў арэнду жылых і нежылых памяшканняў за ўсе 12 месяцаў. Калі ён дасягнуў агульнай сумы 6116 рублёў і больш, тады трэба наведаць падатковую інспекцыю. Такія даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 13 працэнтаў. Пры гэтым сумы падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаныя за 2018 год, падлягаюць заліку пры вылічэнні падатку па стаўцы 13 працэнтаў.

ПРЫ СПЫНЕННІ БУДАЎНІЦТВА І ПАГАШЭННІ ЖЫЛЛЁВЫХ АБЛІГАЦЫЙ

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацый забудоўшчыкаў.

Спецыялісты адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, абкладаюцца падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней была дадзена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэкларaваць таксама і даходы, якія былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя падаецца ў тым выпадку, калі па ўнесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў праведзены маёмасны падатковы вылік.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў у мінулым годзе такія грашовыя сродкі, абавязаны заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была выдзелена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Сяргей КУРКАЧ.

Антытытунёвая палітыка

Цыгарэты на касе прыбяруць?

Заканадаўства па курэнні стане больш жорсткае

Прэзідэнт падпісаў дэкрэт № 2. Новыя нормы павінны паступова абмежаваць даступнасць табачных вырабаў і папярэдзіць негатыўны ўплыў курэння на здароўе насельніцтва.

Дакумент карэкціруе дэкрэты № 28 ад 17 снежня 2002 года і № 4 ад 18 кастрычніка 2007 года. Ім прадугледжана заканадаўчае рэгуляванне вытворчасці, звароту і выкарыстання электронных сістэм курэння, а таксама прылад для нагрэву тытуню без яго гарэння ці тлення — сістэм для ўжывання тытуню. На такія сістэмы будуць распаўсюджвацца асобныя прававыя нормы, якія дзейнічаюць у дачыненні да тытунёвых вырабаў.

У прыватнасці, права на дзейнасць, звязаную з вытворчасцю і зваротам сістэм для ўжывання тытуню, электронных сістэм курэння і вадкасцяў для іх, даецца толькі суб'ектам гаспадарання Беларусі. Забараняецца адкрытая выкладка вадкасцяў для электронных цыгарэт у вітрынах і іншым гандлёвым абсталяванні. Нельга таксама рэкламаваць і прадаваць іх непаўналетнім. Будуць абмежаваны месцы продажу і выкарыстання электронных сістэм курэння.

У дэкрэце замацавалі пералік месцаў, дзе курыць забаронена. Гэта дапаможныя памяшканні жылых дамоў, ліфты, аўтамабілі, што перавозяць дзяцей да 14 гадоў, дзіцячыя пляцоўкі, працоўныя месцы ў памяшканнях, тэрыторыі і памяшканні спартыўна-аздараўленчых лагераў, устаноў адукацыі, падземныя пераходы, прыпынкі і пасадачныя пляцоўкі.

З 1 студзеня 2020 года ў крамах, гандлёвая плошча якіх большая за 1000 квадратных метраў, прадаваць тытунёвыя вырабы, сістэмы для ўжывання тытуню, электронныя сістэмы курэння і вадкасці для іх будуць толькі праз таварныя аддзелы. А з 1 студзеня 2022 года ў крамах і павільёнах забароняць выкарыстоўваць для захоўвання і продажу тытунёвых вырабаў абсталяванне над кантрольна-касавымі вузламі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 1 (88)

IT

У канцы мінулага года ў Ваеннай акадэміі адбылося ўрачыстае адкрыццё навастворанага падраздзялення Узброеных Сіл — роты інфармацыйных тэхналогій. Першыя навіны пра тое, што ў войску з'явіцца новае фарміраванне, прыйшлі крыху болей за паўгода таму. І вось — адбылося. Цяпер байцы будуць супрацьстаяць кіберпагрозам і распрацоўваць спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне. Зрэшты, аб усім па парадку.

НА ВАРЦЕ КІБЕРПРАСТОРЫ

У адкрыцці роты інфармацыйных тэхналогій прынялі ўдзел **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ і начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.**

З сарака праграмістаў у вайсковай форме толькі чатыры не маюць істотнага досведу працы. У паслужным спісе астатніх — праца на працягу некалькіх гадоў, якая сумяшчалася з вучобай на дзённым аддзяленні. Многія з іх працавалі ў кампаніях - рэзідэнтах Парка высокіх тэхналогій.

— Задача гэтых хлопцаў — стварэнне праграмнага прадукту, — зазначыў Андрэй Раўкоў. — Яны будуць выконваць ваенна-прыкладныя задачы, сярод якіх — праграмаванне, адладка і тэсціраванне алгарытмаў. Мы ўручаем ім тэхніку, на якой яны будуць ствараць, увасабляць свой інтэлектуальны патэнцыял і даваць вынікі дзеля павышэння абараназдольнасці краіны. Кірункі дзейнасці звязаны з навігацыяй, аўтаматызаваным кіраваннем войскамі, мадэляваннем баявых дзеянняў і шэрагам іншых, у тым ліку сакрэтных, задач.

Першапачатковы конкурс у роту інфармацыйных тэхналогій аказаўся даволі высокі — 8 чалавек на месца. У выніку сюды трапілі маладыя людзі, якія маюць вышэйшую адукацыю, звязаную з высокімі тэхналогіямі. 40 ваеннаслужачых праходзяць тут тэрміновую воінскую службу. Але, каб іх адабраць, давялося пагутарыць з сотнямі людзей.

— Ваенная акадэмія распрацавала палажэнне аб роце інфармацыйных тэхналогій, — кажа **выконваючы абавязкі намесніка начальніка акадэміі па навуковай рабоце кандыдат тэхнічных навук Дзмітрый САХАРУК.** — Фактычна гэта новае падраздзяленне ва Узброеных Сілах, якое ставіць за мэту распрацоўку праграмных прадуктаў і дакументацыі для ўзораў тэхнікі, якая паступае на ўзбраенне. Суперсучасныя рабочыя месцы разгорнуты для ваеннаслужачых роты інфармацыйных тэхналогій.

Пры арганізацыі рабочых месцаў вялікую ўвагу мы і распрацоўшчыкі ўдзялілі эргаміцы і тэхнічнай эстэтыцы. За кожным ваеннаслужачым будзе замацаваны асобны камп'ютар для выканання задач па прызначэнні. Асаблівасцю рабочага месца з'яўляецца высокапрадукцыйная працоўная станцыя, якая сабрана на базе сучаснага працэсара Intel Core i7, шырокафарматны манітор, які без шкоды для здароўя дазваляе апрацоўваць адразу некалькі заданняў у шматаконным рэжыме, а таксама 3D-графіку ў высокім раздзяленні. Усе камп'ютары, якія працуюць у роце інфармацыйных тэхналогій, аб'яднаны ў адну лакальную сетку. Яна кіруецца серверным вузлом. Зараз намі ўжо атрыманы заданні ад падраздзялення Міністэрства абароны, Генеральнага штаба, Узброеных Сіл. Прызначаны навуковыя кіраўнікі. І з першага ж дня мы пачалі выконваць задачы пра прызначэнні. Таксама будзем чытаць цыкл лекцый па асаблівасці распрацоўкі праграм ва Узброеных Сілах. Моладзь цяпер вельмі добра падкавана ў IT. З іншага боку, у войску зараз вельмі шмат высокатэхналагічнага абсталявання і зброі, якія патрабуюць пэўных ведаў у тэлекамунікацыйнай сферы. І мы разлічваем, што вучэбна-матэрыяльная база дазволіць паказваць максімальны вынік, што, у сваю чаргу, умацуе абараназдольнасць Беларусі.

Размяшчэнне роты нічым не адрозніваецца ад звычайнага. Акрамя аднаго «але». Не сакрэт, што працяглае знаходжанне за камп'ютарам азначае тое, што фізічная нагрузка ў гэты час будзе мінімальная. І таму ў размяшчэнні былі ўсталяваны сілавыя трэнажоры. Яны дапамогуць размяцца пасля працоўнага дня.

— Сярод іншага — і інфарматызацыя самой акадэміі, — працягвае Дзмітрый Сахарук. — Гэта патрэбна, каб мадэрнізаваць навучальны працэс. Напрыклад, традыцыйна вывучэнне, скажам, радыёстанцыі выглядае наступным чынам. У нас іх усяго адна ці дзве. Таму мы вывучаем апаратуру паслядоўна мінігрупамі па два-тры чалавекі. Цяпер жа мы плануем стварыць такі клас, дзе будзе знаходзіцца 3D-мадэль гэтай радыёстанцыі, з дапамогай чаго можна будзе «разабраць» яе віртуальна. Да таго ж будзе значна эканоміцца месца ў навучальнай аўдыторыі. Скажам, у адным класе сёння мы можам разгарнуць лабараторную ўстаноўку, прысвечаную сродкам сувязі. Заўтра ў гэтым жа класе пачнём вывучаць сістэмы сучасных самалётаў. Яшчэ праз дзень — узбраенне або аўтаматычнае кіраванне. І гэта вельмі зручна — даказана, што падобная мадэль навучання спрыяльна адбіваецца на ўзроўні падрыхтоўкі тэхнічнага персаналу. І больш за тое — дзякуючы віртуальнаму асяроддзю мы цяпер атрымліваем магчымасць вывучаць узоры тэхнікі, якія не знаходзяцца на ўзбраенні ў беларускім войску. Мяркуем здаць першыя гатовыя прадукты да восені. Гэта неабходна для таго, каб цяперашні прызыў яшчэ паспеў паўдзельнічаць у тэсціраванні і ўкараненні распрацаваных прадуктаў.

З сарака праграмістаў у вайсковай форме толькі чатыры не маюць істотнага досведу працы. У паслужным спісе астатніх — праца на працягу некалькіх гадоў, якая сумяшчалася з вучобай на дзённым аддзяленні. Многія з іх працавалі ў кампаніях — рэзідэнтах Парка высокіх тэхналогій.

Дзмітрый Гаравы родам са Светлагорска. За плячыма ў хлопца — скончаны факультэт інфармацыйных тэхналогій БДТУ па спецыяльнасці «праграмнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі мабільных сістэм». А таксама — і практычны досвед.

— Я працаваў па спецыяльнасці ў камерцыйнай арганізацыі з канца трэцяга курса. Так набраў стаж у паўтара года. Адпускалі з працы са шкадаваннем, але што зробіш? Тут жа ёсць падабенства з тымі задачамі, з якімі я ўжо раней сутыкаўся яшчэ «на грамадзянцы». І заўважыў, што асабовы склад стараюцца адбіраць так, каб яго прадстаўнікі максімальна раскрылі свае здольнасці і рабілі тое, з чым ужо знаёмы.

— Як ішоў адбор у роту на вашым прыкладзе?

— Пытанне аб маёй прыдатнасці да воінскай службы вырашалася даволі доўга. Але мне патэлефанавалі з Ваеннай акадэміі і зладзілі сумоўе па тэлефоне. Усе хлопцы, якія прызваны ў роту, будуць служыць год, паколькі за іх плячыма — вучоба ва ўніверсітэце. Толькі пяць з іх правядуць тут шэсць месяцаў, бо правучыліся адзін год на ваеннай кафедры.

— Што б вы пажадалі студэнтам?

— Пастаянна вывучайце нешта новае. IT — вельмі шырокая галіна, дзе можна развівацца. Трэба выбраць кірунак, які больш падабаецца. І памятайце: калі станеш — то адстанеш. Праграмаванне зараз развіваецца проста шалёнымі тэмпамі, і тое, што было актуальным два-тры гады таму, адыходзіць на іншы план.

Яшчэ да ўрачыстага адкрыцця роты інфармацыйных тэхналогій усе ваеннаслужачыя прайшлі курс пачатковай ваеннай падрыхтоўкі, выканалі практыкаванні па стрэльбах і прынялі прысягу. Наперадзе іх чакае ўдумлівая праца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота БелТА.

Ваенныя навіны

Турэцкі вектар

Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй Раўкоў і міністр нацыянальнай абароны Турцыі Хулусі Акара правялі двухбаковыя перагаворы. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства абароны.

Тэмай гутаркі сталі стан і перспектывы супрацоўніцтва паміж абароннымі ведамствамі дзвюх краін. Апрача таго, кіраўнікі міністэрстваў таксама абмяняліся меркаваннямі па пытаннях рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі.

Беспілотнікаў стала болей

У 927-ы цэнтр падрыхтоўкі і прымянення беспілотных авіяцыйных комплексаў паступілі новыя ўзоры ўзбраення.

Гэта беспілотны авіяцыйны комплекс «Суперкам С100» і мадэрнізаваны наземны мабільны пункт кіравання на базе аўтамабіля «Урал-43203». Цэнтр наведаў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег Белаконеў і азнаёміўся з новымі набыткамі. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

Новы беспілотны авіяцыйны комплекс прызначаны для таго, каб весці паветраную разведку ў любы час сутак у розных метэаўмовах. Ён здольны атрымліваць, перадаваць і запісваць інфармацыю ў рэжыме анлайн, паралельна вызначаючы каардынаты аб'екта, за якім назірае.

Сярод пераваг новага мабільнага пункта кіравання — магчымасць кіравання беспілотнікам сіламі разліку ў аўтаномным рэжыме. Машына абсталявана ўсім неабходным: сістэмамі энерга- і жыццезабеспячэння, а таксама сувязі.

Кіруючыся Венскім дакументам

Беларусь наведала інспекцыйная група з Федэратыўнай Рэспублікі Германія. Гэта адбылося ў адпаведнасці з палажэннямі Венскага дакумента, падпісанага ў 2011 годзе, паведамілі ў прэс-службе Мінабароны.

Інспектары прыбылі ў 103-ю асобную гвардзейскую ваенна-паветраную брыгаду. Яны ацэньвалі інфармацыю, перададзеную Беларуссю дзяржавам — удзельніцам АБСЕ ў дачыненні да асабовага складу, асноўных сістэм узбраення і ваеннай тэхнікі вайсковай часці.

У брыгадзе пабывалі, акрамя двух прадстаўнікоў ФРГ, па адным ваенным інспектары з Даніі і Латвіі.

На музычнай хвалі

«Нас не зблытаеш нават у цывільным»

Ансамбль песні і танца Узброеных Сіл даўно стаў адным з самых вядомых творчых калектываў нашай краіны. Сёлета ён адсвяткаваў 80-ы дзень нараджэння. Узрост — пачэсны. І заслугі таксама. У пачатку 2019 года калектыў быў адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва за высокія дасягненні і рэалізацыю патрыятычнага праекта «Айчыне служым». Паспрабуем жа зазірнуць за кулісы...

— Наш калектыў не падобны на іншыя, — кажа **мастацкі кіраўнік ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Уладзімір ВАРАПАЕЎ.** — Гэта дзякуючы таму, што мы яго самі такім зрабілі. Наша галоўная задача — абарона Айчыны праз нашу творчасць. Праз танец, праз песню мы даносім слухачам любоў да краіны, расказваем пра магутнасць нашых Узброеных Сіл. Ды і падобнага нашаму калектыву ў краіне няма. Вельмі няпроста аб'яднаць пад адным дахам салдат тэрміновай і кантрактнай службы і проста цывільных людзей, якія, здавалася б, як могуць падпарадкоўвацца ваенным? Але ўзаемаразуменне, гармонія, якая ў нас ёсць унутры калектыву, разуменне таго, у імя чаго мы працуем, дасягаюцца дзякуючы няспыннаму адбору выканаўцаў. Выпадковых людзей у нас няма.

З нашых шэрагаў выйшлі вельмі знакамітыя артысты. Дастаткова згадаць Уладзіміра Мулявіна, Віктара Вуячыча, Яраслава Еўдакімава, Валерыя Кучынскага, Ігара Алоўнікава. У нас служыў вядомы тэлевядучы Юрый Нікалаеў.

У нашым рэпертуары — не песні-аднадзёнкі, а фундаментальныя творы, мы самі ствараем музыку, якую выконваем. Да таго ж нас ні з кім не зблытаеш — дзякуючы вонкаваму выгляду і дысцыпліне, нават калі мы прыйдзем у цывільным адзенні. І гэта — наша візітоўка.

— Наколькі складана трапіць у ансамбль?

— У нас па штатным раскладзе прадугледжаны 74 стаўкі. Натуральна, што пастаяннага нічога няма, нехта сыходзіць, нехта прыходзіць. Усе выканаўцы мусяць мець музычную адукацыю, але ў якасці выключэння мы можам узяць і самародкаў. Былі такія выпадкі.

— Ці ёсць у ансамбля выступленне, якое можна вылучыць асобна?

— Пэўна, не. Мы да ўсіх імпрэз ставімся вельмі сур'ёзна. Напрыклад, мы выязджаем штогод у Расію, дзе выступаем падчас спаборніцтваў па танкавым біятлоне, у якіх удзельнічаюць больш за два дзясяткі краін. Наша выступленне транслюецца на ўвесь свет. Ці вось з апошняга — перамога на міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі «Хайнуўка», які праходзіў у Польшчы. Рэпутацыя, як вядома, заслугоўваецца справамі і часам. І кожны наш канцэрт — гэта цаглінка ў вялікі будынак.

— Ці супрацоўнічаеце з іншымі творчымі калектывамі?

— А як жа! На мінулым тыдні на сцэне Цэнтральнага дома афіцэраў мы сумесна выступалі з выхаванцамі дзіцячай музычнай школы № 10 імя Глебава. Кантактуем і з эстрадай. У нашым актыве — сумесныя выступленні з Анатолем Ярмоленкам, Ірынай Дарафеевай, Інай Афанасьевай, Уладзімірам Правалінскім, гуртамі «Сябры», «Купалінка», Litesound. Вельмі шмат працавалі з Ігарам Лучанком. А што да замежных артыстаў, то згадваюцца канцэрты з Алегам Газманавым, Аляксандрам Маршалам, Іосіфам Кабзонам...

І гастрольны графік у нас вельмі насычаны. Мы даём каля 200 канцэртаў за год. Здараецца і так, што выступаем два разы на дзень. Напрыклад, ужо рыхтуецца святочная праграма, прымеркаваная да 75-годдзя вызвалення Беларусі.

Фронтменам любога музычнага калектыву, які выконвае песні, з'яўляецца вакаліст. Міхаілу Лілу, салісту і артысту хору ансамбля песні і танца, нядаўна споўнілася 24 гады. У паслужным спісе таленавітага юнака, які спявае лірычным барытонам, — лаўрэацтва і перамога больш чым на 30 міжнародных конкурсах. Ён — трохразовы лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Двойчы быў фіналістам дзіцячага конкурсу «Песня для Еўрабачання», дзе займаў высокія месцы. У ансамблі ён зусім нядаўна — два месяцы. Да гэтага тры гады быў салістам Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.

— Я трапіў у ансамбль пасля таго, як прайшоў тры творчыя праслухоўванні, здаў фізічныя нарматывы і тэст на псіхалагічную сумяшчальнасць, — заўважае Міхаіл Ліла. Выступленні ансамбля я бачыў з самага дзяцінства, паколькі гэты калектыў — адзін з трох вядучых у краіне. Але думка пра тое, што я сюды траплю? Тады гэта падавалася фантастыкай...

Мяне праслухоўвалі прыкладна тры месяцы. Папрасілі паказаць як мага больш дыяпазон свайго тэмбру голасу ў плане афарбовак, стылёвых кірункаў. І канешне ж, рэпертуар таксама важны. Я выконваў класічныя оперныя творы, раманс Рахманінава, аперэтачныя і джазавыя творы, а таксама сучасныя творы на патрыятычную тэматыку.

Але за два месяцы службы ў ансамблі рэпертуар папоўніўся каласальна. За кароткі тэрмін мне трэба было вывучыць вялікую праграму да 80-годдзя ансамбля і шмат прыгожых песень. За пару дзён я прачытаў больш за 30 харавых партытур, хоць да таго з імі не сутыкаўся. Ужо і саліраваў адзін з твораў — «Чырванасцяжная акруга Беларуская».

— Міхаіл, а дзе цяжэй спяваць — сола або ў хоры?

— Шчыра кажучы, не ведаю. Я ж калісьці вучыўся менавіта на харыста, а пасля перавучыўся на опернага спевака. І вось на шматлікіх конкурсах спяваеш у адзіночку, а пасля вяртаешся дадому, ідзеш у хор — і ўсё нармальна. Справа ў тым, што праца саліста — вельмі адказная, на цябе ўсе глядзяць. Слухач не прабачыць ніводны фальш, прапушчаны склад або не зусім зразумелую дыкцыю. А ў хоры вельмі важны «эфект пляча». Напрыклад, нельга разам з суседам узяць дыханне: гэта лічыцца непрафесіянальным. У кансерваторыі мы харавыя цяжкасці нават вывучалі асобным прадметам.

— Наколькі складаны графік вайсковага спевака?

— У ансамблі я знаходжуся з 8-й раніцы. За мной замацаваны два кабінеты. У харавым класе я пачынаю распявацца. Калі паступаюць указанні ад афіцэраў, я іх выконваю. А 9-й раніцы ў нас пачынаецца першая гадзіна заняткаў. Яны цягнуцца пяць гадзін. Пасля ў нас абед і самападрыхтоўка. Паколькі рэпертуар у хору і ў аркестра змяняецца пастаянна, то трэба валодаць моцным самакантролем. Але перш за ўсё мы — ваеннаслужачыя з усімі іх абавязкамі.

— А як пераадолець страх перад публікай?

— Боязі ў мяне не было з дзяцінства. У малым узросце ты не такі самакрытычны. І выходзячы выступаць на сцэне ў чатыры-пяць гадоў, лёгка забудзеш куплет або паўторыш яго двойчы. Але калі гледачы гэта заўважаць, то зробяць скідку на ўзрост, чаго не будзе з дарослымі. Вучыцеся на сваіх памылках — і ўсё атрымаецца! Адзін італьянскі майстар мне сказаў цудоўную рэч: калі мы не спяваем, мы спяваем. І наадварот. Гэта пра тое, што калі людзі кажуць, то яны спяваюць, каб данесці сваю думку да слухача.

«З нашых шэрагаў выйшлі вельмі знакамітыя артысты. Дастаткова згадаць Уладзіміра Мулявіна, Віктара Вуячыча, Яраслава Еўдакімава, Валерыя Кучынскага, Ігара Алоўнікава. У нас служыў вядомы тэлевядучы Юрый Нікалаеў».

А вось старшына Аляксандр Водчыц шэрагі ансамбля папоўніў больш за тры гады таму.

— Я сумяшчаю дзве пасады. У вайсковым складніку старшына — чалавек, які адказвае за салдат тэрміновай ваеннай службы, чысціню, парадак і дысцыпліну, ахайны знешні выгляд. А ў творчым складніку я — трубач. Прапанавалі праслухацца ў ансамблі, яшчэ калі я вучыўся ў каледжы. Трапіў сюды на тэрміновую ваенную службу, пасля перавёўся на кантракт. Пад маім кіраўніцтвам — пяць чалавек з новага прызыву і чатыры з ранейшых.

Займаюся музыкай гадоў з дзесяці. І калі шмат каго ў музычную школу адводзяць бацькі, то я пайшоў туды сам. У нас па суседстве грала фартэпіяна. І мне моцна спадабаліся гэтыя гукі. Два гады адвучыўся па класе фартэпіяна, а пасля пачуў гук трубы. І тут я зразумеў, што гэты інструмент — мой. Пяць гадоў я адвучыўся па класе трубы ў дзіцячай музычнай школе, пасля чатыры гады ў каледжы. І тры з паловай гады ўжо тут.

Труба займае галоўнае месца ў аркестры. Мы граем як сола, так і ў аркестры. Шмат кампазіцый выконваюцца ўжо на памяць, таму што многія моманты даводзяцца на рэпетыцыях да аўтаматызму. У нас у ансамблі толькі два трубачы. І гэта ўскладвае яшчэ большую адказнасць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Кофеин» (УНП 690646615, Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, д. Острошицкий Городок, ул. Ленинская, д. 46), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

Дата и время проведения торгов: **12 февраля 2019 года**. Начало в 12.00, окончание в 14.00. Заявки принимаются с 26 января 2019 года по 11 февраля 2019 года.

Место проведения торгов: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «Кофеин» (УНП 690646615)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт».

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, руб	Шаг торгов	Задаток
1	Капитальное строение (здание нежилое), инв. № 611/С-10530, площадь 1670,20 кв. м	64 000,00 руб. (без учета НДС)	5 %	5 %
	Земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения, инв. № 620450100001002789, площадь 0,3289 га	12 000,00 руб. (без учета НДС)		
Местонахождение		Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Зеленая, 22		

Для участия в торгах необходимо:

В срок по **11 февраля 2019 года** (за день до окончания приема заявлений) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY56MTBK30120001093300086460, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация». Размер задатка составляет 5 % стоимости лота в размере 3800,00 белорусских рублей.

Подать организатору торгов в срок с даты опубликования по 11.02.2018 (за день до торгов) заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

– заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

– на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Извещение о проведении 26 февраля 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

Предмет торгов
«административное помещение 23» общей площадью 33,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786227, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-23; «административное помещение» общей площадью 39,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786228, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-24; «административное помещение 25» общей площадью 32,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786229, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-25; «административное помещение 26» общей площадью 58,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786230, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-26; «административное помещение 27» общей площадью 38,1 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786231, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-27; «административное помещение 28» общей площадью 38,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786232, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-28; «административное помещение 29» общей площадью 37,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786233, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-29; «административное помещение 30» общей площадью 17,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786234, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-30; «административное помещение» общей площадью 156,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129710, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-31; «административное помещение 37» общей площадью 16,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786241, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-37; «административное помещение 38» общей площадью 17,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786242, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-38; «административное помещение 39» общей площадью 15,5 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786243, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-39; «административное помещение 40» общей площадью 16,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786244, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-40; «серверная, подсобное помещение» общей площадью 33,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786245, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-41; «административное помещение» общей площадью 64,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129713, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-43; «административное помещение» общей площадью 16,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129714, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-43а; «административное помещение 44» общей площадью 14,7 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786248, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-44; «комната приема пищи» общей площадью 5,5 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-70786249, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-45; «административное помещение» общей площадью 6,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129715, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-48; «административное помещение» общей площадью 15,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129716, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-49; «административное помещение» общей площадью 42,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/D-708129717, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, 8-50
Начальная цена: 2 155 000,00 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 215 000,00 бел. руб.
Обременение: аренда

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 26 февраля 2019 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 28.01.2019 по 22.02.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»).

Извещение о проведении аукционов 18 февраля 2019 года

	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3
Предмет аукциона	**Здание сельского клуба с подвалом и террасой** 1972 г. п., S общ. – 357,9 кв. м, 1-й этаж, стены кирпичные, кровля, совмещенная мягкая, рулонная по ж/б плитам; **забор** дощатый, решетчатый, L-17,19 м	**Здание сельского дома культуры с тремя пристройками** 1958 г. п., 1-й этаж, S общ. – 235,1 кв. м, кирпичное, кровля шиферная; **сарай** 1958 г. п., бревенчатый, кровля шиферная, S – 23 кв. м; **уборная** 2005 г. п., дощатый, кровля шиферная, S – 3 кв. м; **площадка** – асфальтобетон, S-31 кв. м; **кабельная линия электропередачи** – 10,9 м	**Здание сельского дома культуры с подвалом и двумя террасами** 1984 г. п., кирпичное, 2-й этажа, S общ. – 1565,5 кв. м, кровля рулонная; **площадка** асфальтобетонная, S-642,3 кв. м; **дорожка** асфальтобетонная, S – 107,9 кв. м; **дорожки** бетонные, S – 14,2 и 36,6 кв. м; **бордюр** 101,7 м; **кабельная линия электропередачи** L – 82,2х2 м; **наружная водопроводная сеть** 10,8 м; **наружная сеть канализации** 93,9 м; **наружная сеть канализации** 17,0 м; **наружная тепловая сеть** 79,0х2 м; **многолетние насаждения** – 9 шт.
Местонахождение	Волковысский район, д. Богди, 49	Волковысский район, д. Конюхи, ул. Центральная, 94	Волковысский район, д. Мочулино, ул. Советская, 7
Начальная цена продажи	2 базовые величины	5 базовых величин	30 127 руб. 37 коп.
Сумма задатка	1 базовая величина	1 базовая величина	3 100 руб.
Размер земельного участка (под застройкой)	0,0815 га	0,0884 га	0,3449 га
Продавец	Отдел культуры Волковысского районного исполнительного комитета		
Организатор аукциона	Комитет «Гроднооблимущество»		
Дата и время проведения аукциона	18 февраля 2019 г. в 11.30	18 февраля 2019 г. в 11.30	18 февраля 2019 г. в 12.00
Место проведения аукциона	г. Гродно, ул. 17 Сентября,39		
Дата и время окончания приема документов	12 февраля 2019 г. до 17.00		
Контактные телефоны	**Волковыск, тел.: 8 (01512) 4 50 25; 4 57 71; 4 51 74, Гродно, тел.: 8 (0152) 77 29 15, 72 25 18; 72 21 02**		

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і газеты «Звязда»*

У СТУДЗЕНІ 44-га...

Па старонках партызанскіх газет 75-гадовай даўніны

Студзень 1944 года. Савецкія войскі цалкам знялі блакаду вакол Ленінграда. На далёкіх франтах адбылася знакамітая кровапралітная бітва пры Монтэ-Касіна — у якой, дарэчы, вызначыліся і многія героі-беларусы; пачалося вызваленне Маршалавых астравоў і Корсунь-Шаўчэнкаўская аперацыя, у выніку якой былі ўзятыя ў акружэнне каля 20 тысяч нямецкіх салдат. На франтах блізкіх таксама горача: працягваецца вызваленне Гомельшчыны і Палескай вобласці... А на ўжо вызваленай ад немцаў тэрыторыі Беларускай ССР жыццё марудна, але ўсё ж пераходзіла на мірныя рэйкі — так, Саўнаркам прыняў рашэнне аб аднаўленні калгасаў і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Да вясны 1944 года, дарэчы, паводле афіцыйных лічбаў, былі адноўленыя 2880 гаспадарак з больш як 3100 даваенных, але гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Тым часам партызанскія і падпольныя газеты, якія ўсё гэтак жа выходзяць на акупаванай тэрыторыі, працягваюць пісаць сваю хроніку, перачытваючы якую можна атрымаць больш поўнае ўяўленне пра падзеі чацвёртага года Вялікай Айчыннай вайны.

Безумоўна, галоўнай падзеяй у першых студзеньскіх нумарах усіх беларускіх выданняў стала 25-я гадавіна абвяшчэння БССР. Гэтай даце былі прысвечаны рэдакцыйныя перадавіцы і своеасаблівыя партызанскія справаздачы. Вось, напрыклад, што пісала са святочнай нагоды 1 студзеня 1944-га насценгазета «Голас партызана» 2-й роты партызанскага атрада «За Радзіму» пад кіраўніцтвам адказнага рэдактара Найдзёнава: «Партызаны брыгады Фрунзэ зрабілі многае, толькі за 11 месяцаў знішчана ці пашкоджана: паравозаў — 35, вагонаў з жывой сілай і тэхнікай — 346, аўтамашын — 110, трактароў — 7, разгромлена нямецкіх гарнізонаў — 7, чыгуначных мастоў — 2, парвана ліній сувязі — 2383 м, парваны провад Берлін — фронт — 10 разоў, забіта нямецкіх салдат — 3789, афіцэраў — 194, здраднікаў-паліцэйскіх і іншых шпіёнаў — 572, паранена нямецкіх салдат і афіцэраў — 1575, здраднікаў — 153. Але гэтага мала за тыя ахвяры і здзекі з нашага народа, за ўсе тыя пакуты і слёзы нашых бацькаў, матуль, братоў і сясцёр. Камандзіры і байцы нашага атрада (асабліва 1-я рота, кам. роты Літвіненка, п-к роты Цыбулькін) таксама прыйшлі да свята з вялікімі поспехамі ў справе разгрому нямецкіх захопнікаў. Толькі за лістапад і снежань былі спушчаны пад адхон 3 эшалоны з жывой сілай і танкамі, забіта 999 салдат і афіцэраў, паранена 939».

Барацьба працягваецца

Газета Палескага абкама і Мазырскага гаркама КП(б)Б «Бальшавік Палесся» ў першыя дні 1944-га рапартуе: «25-ю гадавіну існавання БССР мы адзначаем ва ўмовах, калі Чырвоная Армія, адагнаўшы ворага на сотні кіламетраў, ачышчае беларускую зямлю ад нямецкіх акупантаў. АМАЛЬ ПОЎНАСЦЮ ВЫЗВАЛЕНА ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА МАГІЛЁЎСКАЙ, ВІЦЕБСКАЙ І ПАЛЕСКАЙ АБЛАСЦЕЙ. Зноў вярнулася жыццё ў Хойнікі і ў Брагін, у Васілевічы і ў Камарын, у Ельск і ў Нароўлю. На вызваленай зямлі аднаўляецца народная гаспадарка і культура, залечваюцца раны, нанесеныя крывавым гаспадараннем гітлераўскіх захопнікаў... Але барацьба яшчэ не закончана. Вораг яшчэ жорстка супраціўляецца. Ён чапляецца за кожны рубеж, за кожны бугарок нашай зямлі. Яшчэ стогне пад фашысцкай пятой наш абласны цэнтр — горад Мазыр. Яшчэ плачуць абяздоленыя фашысцкімі душагубамі жанчыны і дзеці ў Глуску і ў Петрыкаве, у Тураве і ў Жыткавічах. Яшчэ палыхае агонь пажараў у Даманавіцкім, Калінкавіцкім і Капаткевіцкім раёнах».

«Зараз, калі на нашу зямлю павеяў вецер вызвалення, калі мы сустракаемся з нашымі братамі-франтавікамі, нам не сорамна пазіраць ім у вочы. Блізасць нашай сустрэчы з Чырвонай Арміяй абавязвае нас яшчэ мацней біць ворага, знішчаць яго жывую сілу і тэхніку, руйнаваць яго камунікацыі, —- заклікае баявых паплечнікаў герой Савецкага Саюза, камандзір Н-скай партызанскай брыгады Фёдар П. (Адзін з вядомых кіраўнікоў партызанскага руху Фёдар Паўлоўскі, які ўзначальваў 123-ю партызанскую брыгаду імя 25-годдзя Беларускай ССР. Брыгада дзейнічала на Палессі ў Кастрычніцкай партызанскай зоне з цэнтрам у пасёлку Рудабелка. — **Аўт.**)

«На Мозырскім напрамку войскі Беларускага фронту 11 студзеня перайшлі ў наступленне. Развіваючы поспех, савецкія часці 13 студзеня ўплатную падышлі да гарадоў Мозыр і Калінкавічы, 14 студзеня савецкія войскі авалодалі абласным цэнтрам Беларускай ССР горадам Мозыр, горадам і буйным чыгуначным вузлом Калінкавічы — важным апорным пунктам немцаў на Палескім напрамку», — знаходзім у сярэдзіне студзеня ў зводках Саўінфармбюро.

Тым часам, паводле падлікаў авіяцыйнага аглядальніка Рэйтар, звесткі якога таксама часта друкуюцца ў партызанскіх газетах, «английские и американские самолеты с 1 по 26 января сбросили на Германию и оккупированные ею страны Европы 12 000 тонн бомб».

Агітацыя супраць прапаганды

«Большэвіцкі сцяг» Рудзенскага падпольнага райкама ў адным са студзеньскіх нумароў зларадна цытуе лісты нямецкіх служак на радзіму: «Дарагая, прыгожая Гертруда! — піша Біллі Бек са станцыі Рудзенск. — Учора быў у камандыроўцы ў Мінску. Усю ноч быў у дарозе. Гэта найбольш цяжкі шлях на рускім прасторы. Не ведаю, як застаўся жывы. Партызаны не даюць ні выйсці, ні праехаць. А Гітлер яшчэ гаворыць пра перамогу. Знішчаць нас тут, калі спознімся ўцячы...» «Нават Адольфу Дэберу — брыгадзіру службы чыгункі станцыі Рудзенск, надакучыла вайна, і ён у пісьме да Берты Дэбер праклінае яе арганізатараў: «Можна ўсё перанесці, толькі не гэту вайну. Сваімі вачамі я бачу, як пагібаюць немцы. Хутчэй бы задушыўся Гітлер і яго прыспешнікі, можа, тады б жыў застаўся...» «Усе гэтыя пісьмы пісаныя перад Новым годам. У іх няма ні аднаго радка радасці. Іх аўтары ў смяротнай ліхарадцы», — канстатуе аўтар, нагадваючы вядомае выказванне Аляксандра Неўскага «Хто з мячом да нас прыйдзе, ад мяча і загіне».

«Вольная праца» Слонімскага райкама партыі ў нумары за 9 студзеня 1944 года нагадвае чытачам: «21 снежня 1943 года обер-бандыт — генеральны камісар Беларусі Готтберг «урачыста» ўтварыў так званую Цэнтральную Беларускую Раду на чале з прэзідэнтам Радаславам Астроўскім, вядомым старым здраднікам беларускага народа... Готтберг хоча, каб беларус страляў беларуса. І для гэтага плануе змабілізаваць новыя тысячы ў паліцыю і самаахову, хоча стварыць тысячы даносчыкаў і даць ім нявінны тытул «старанных гаспадароў». Немцы хочуць кінуць беларусаў на фронт супроць Чырвонай Арміі і супроць партызанаў, што разбураюць тыл ворага. Таннымі абяцанкамі акупанты хочуць купіць беларуса. Тыя, што знішчылі наш край, што нават косці нашых дзядоў і прадзедаў павыкідалі са Слонімскага могільніка, сёння абяцаюць ахоўваць нашу культуру. Абяцанае падвышэнне пайка — гэта сцягванне нядоімак і падвышэнне паставак нашаму селяніну, каб накарміць нямецкіх звяроў. Абяцаная мануфактура — гэта ваенны мундзір беларусу для адпраўкі на фронт. Бясплатная медыцынская дапамога — гэта доктарскі агляд беларуса перад высылкай у нямецкую катаргу. Знаем іх абяцанкі. Помнім і 1918 год, калі напярэдадні свайго адступлення немцы таксама ўтварылі Цэнтральную Беларускую Раду. Так ужо складаецца, што падчас адступленняў ім патрэбныя «рады». БЕЛАРУСЫ! Калі час вызвалення так блізкі, не дайцеся ашукаць: не будзем сваімі рукамі праліваць уласную кроў! Ні адзін чалавек не павінен паступіць на ганебную службу нямецкай паліцыі. Ні аднаго даносчыка! Ні аднаго грама паставак акупанту! Дапамагайце партызанам, хто чым можа», — заклікае газета.

«Пры чытанні нямецкіх газет на беларускай мове кідаецца ў вочы проста здзіўляючая бессаромная ілжа яе пісакаў. Перад намі трэці нумар «Пагоні» ...У кожным радку нямецка-наёмнай прэсы ілжа і махлярства. Край варварскі знішчаецца, яны заяўляюць — «ідзе адбудова, адраджэнне Беларусі». Немцаў выгналі з усёй Жытомірскай вобласці — яны пішуць, што немцы «пакінулі» адну толькі вуліцу Жытоміра. Чырвоная Армія прарывае франты шырынёй на 50—100 км, займае дзясяткі гарадоў, — яны бубняць: «Атакі адбітыя, мясцовыя ўламанні зарыглёваныя». Вось гэтую штодзённую ілжу, ашуканства, круцельства, халуйска-нявольніцкую службу немцу танныя халуі гітлерызму хочуць назваць «беларускай справай», «беларускім зместам». Без махлярскай брахні сабакі з Баранавіч, Мінска і Берліна не могуць абысціся, бо яны вартуюць двор акупанта», — кпіць газета ў яшчэ адным студзеньскім нумары.

Лёсы паміж радкоў

Падпольны і партызанскі друк аператыўна расказвае пра паспяховыя баявыя вылазкі і падрывы эшалонаў, пра рух наперад Чырвонай Арміі і дасягненні саюзных войскаў, змяшчае праграмныя прамовы першых асоб і важныя ў маштабах усёй савецкай краіны матэрыялы (напрыклад, тэкст новага гімна СССР). Але залішняга пафаснага аптымізму ні ў кога з аўтараў і рэдактараў газет няма. Усе яны, падтрымліваючы ў чытачах дух супраціўлення і веру ў блізкую перамогу, тым не менш, разумеюць, што барацьба працягваецца штодня, штогадзіны, а таму не меншае на старонках партызанскіх газет расказаў пра карніцкія аперацыі, пра землякоў-герояў, якія сталі такімі пасмяротна.

«Характэрны паход фашысцкага звяр'я з Пухавіч і Рудзенска 22 студзеня гэтага года. Бешанымі ваўкамі ўварваліся яны ў вёскі Скрыль, Слабада, Падвілле і Бор Навасёлкаўскага сельсавета Пухавіцкага раёна, спалілі пасёлак Падвілле, забралі жывёлу, абакралі сялян. Больш 90 мужчын і жанчын вёскі Бор фашысты пагналі на германскую катаргу...», — расказвае выданне Рудзенскага падпольнага райкама.

Газета «За Радзіму!» партызанскага атрада імя Свярдлова, што ўваходзіў у склад брыгады імя Л. Даватара, расказвае пра сваіх байцоў без лірыкі, толькі факты. «5 студзеня І узвод на чале з разведкай атрада адправіўся пад Любань на засаду. Па дарозе група сустрэлася з працаўнікам. Завязаўся бой. Немцы і паліцыя ў паніцы пачалі бегчы. У гэтым баі былі забіты 2 немцы і 4 паліцэйскія, цяжка паранены камендант паліцыі. Асабліва адзначыліся ў баі разведчыкі тт. Козел К., Аўрэйцэвіч Н., палітрук Т. Радзівонаў і партызан Грыбок. Адважна і ўмела кіраваў боем нач. разведкі атрада імя Свярдлова тав. Паўлаў А. Трафеі не ўзялі, бо быў цяжка паранены наш разведчык тав. Козел К.». У іншым матэрыяле знаходзім і падрабязнасці пра храбрага разведчыка — Канстанцін Аляксеевіч Козел, камсамолец, «яшчэ будучы не ў партызанах, хадзіў некалькі разоў на падрыў эшалонаў». За баявыя заслугі быў узнагароджаны ордэнам Леніна — але, мяркуючы па тоне заметкі, у гэтым жа студзені 1944-га загінуў...

Пра лёс яшчэ аднаго героя атрада расказвае наступны допіс: «Самаахвярна ішоў у бой і на чыгунку камсамолец тав. Капялевіч Камаль Юдолевіч. Дыверсія — любімая справа тав. Капялевіча. Колькі ініцыятывы, знаходлівасці праявіў ён па набыцці толу, капсулей і іншага выбуховага матэрыялу. Ён плавіў тол з артылерыйскіх снарадаў... пры плаўцы снарад узарваўся. З-за неасцярожнасці загінуў тав. Капялевіч і тав. Бударын».

Такіх заметак вельмі многа, і часта літаральна ў некалькіх радках змяшчаецца ўсё чалавечае жыццё ад нараджэння да смерці. Міжволі прыгадваецца эпізод з фільма «Дажывём да панядзелка», дзе герою паўстання на «Ачакаве» лейтэнанту Шміту ў падручніку па гісторыі было прысвечана ўсяго 15 радкоў. Сотні і тысячы беларускіх герояў-партызан наогул трапілі ў падручнікі толькі ў складзе сухіх лічбаў загінулых, многія не засталіся ва ўспамінах нашчадкаў нават на фотаздымках, толькі вось у гэтых, друкаваных і рукапісных радках на пажоўклых і выцвілых ад часу газетных старонках. Але тым больш каштоўныя — і гэтыя старонкі, і словы партызанскай хронікі, якія захоўваюць памяць...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁМЫ МАЦЯРЫК

Чаму Месяц зноў у трэндзе?

Сёлетні студзень увайшоў у гісторыю касманаўтыкі — кітайская міжпланетная станцыя «Чан'э-4» з першай спробы паспяхова села на адваротным баку Месяца. Гэта важнае дасягненне для краіны, якая ўпершыню адправіла чалавека ў космас у 2003 годзе. Праграма «Чан'э» атрымала назву ў гонар багіні Месяца з кітайскай міфалогіі. Першы апарат гэтай серыі быў запушчаны на арбіту спадарожніка ў 2007-м. «Чан'э-4» мае абсталяванне для даследаванняў геалагічных параметраў спадарожніка. Таксама на яго борце — насенне раслін (у тым ліку бульбы) і лічынкі шаўкапрада. Пра свае планы наконт Месяца абвясцілі шэраг краін. Чым выкліканы такі ажыятаж?

РОБАТЫ НА БАЗЕ

Яшчэ са школьнай праграмы мы ведаем, што Месяц — натуральны спадарожнік нашай планеты, яе пастаянны найбліжэйшы сусед. Гэта скалістае шарападобнае цела без атмасферы і жыцця. Яго дыяметр 3480 кіламетраў — крыху больш за чвэрць дыяметра Зямлі. Сярэдняя адлегласць да Месяца 384 тыс. км. Касмічны карабель пралятае такі шлях менш чым за трое сутак. Першы апарат, які дасягнуў спадарожніка, — савецкі «Месяц-2» — быў запушчаны 12 верасня 1959-га. Першыя людзі ступілі на месяцавую паверхню праз дзесяць гадоў — 20 ліпеня 1969-га — гэта былі астранаўты амерыканскага «Апалона-11».

Ніл Армстранг стаў першым чалавекам, які ступіў на паверхню Месяца. «Гэта адзін маленькі крок для чалавека і вялізны скачок для чалавецтва», — сказаў тады амерыканскі астранаўт. Гэтая фраза стала крылатай. Затым да яго далучыўся калега Баз Олдрын. Спусціўшыся па прыступках пасадачнага месяцавага модуля «Арол», ён паглядзеў на пустынны ландшафт і сказаў: «Пышнае запусценне». Яны былі ўдзельнікамі місіі «Апалон-11», якая адбылася ў ліпені 1969 года. Апошні раз чалавек хадзіў па Месяцы ў 1972 годзе, але ў найбліжэйшы час сітуацыя можа кардынальна змяніцца.

Мяккая пасадка на адваротным баку спадарожніка, якую здзейсніла нядаўна кітайская станцыя «Чан'э-4», — няпростая задача, бо Месяц блакуе прамую сувязь паміж касмічным апаратам і Зямлёй. Таму для поспеху місіі быў запушчаны спадарожнік-рэтранслятар. Зонд апусціўся ў кратар Карман, а неўзабаве кітайскае аэракасмічнае агенцтва парадавала зямлян відэаролікам аб палёце месяцахода ад першай асобы. Нацыянальнае касмічнае ўпраўленне CNSA рыхтуе тры новыя місіі на спадарожнік. І гэта не лічачы «Чан'э-5», якая адправіцца на Месяц у снежні гэтага года. Па словах намесніка кіраўніка CNSA Ву Яньхуа, місія з парадкавым нумарам шэсць павінна будзе прывезці ўзоры грунту з Паўднёвага полюса Месяца. Сёмая правядзе комплексныя даследаванні ў тым жа рэгіёне. Але самую вялікую цікавасць уяўляе сабой восьмая місія. «Мы спадзяёмся, што «Чан'э-8» дапаможа выпрабаваць некаторыя тэхналогіі і правядзе разведку, неабходную для будаўніцтва сумеснай месяцавай базы, прызначанай для мноства краін», — сказаў Ву.

Першая база на Месяцы, хутчэй за ўсё, будзе рабатызаваная, як склады Amazon, адзначае The Conversation. Гэта дазволіць цалкам праверыць працаздольнасць неабходнай інфраструктуры і сістэм забеспячэння да прыбыцця людзей. Будаўніцтва месяцавай станцыі нічым не адрозніваецца ад будаўніцтва першай нафтавай вышкі ў акіяне. Трэба прадумаць лагістыку для рухомых будаўнічых

дэталяў, распрацаваць тэхніка-эканамічныя абгрунтаванні і ў даным выпадку вывучыць і апрабаваць узоры глебы. Кітай ужо робіць крокі ў гэтым кірунку. Знаёмства з месяцавым грунтам неабходна для будаўніцтва падземнага жылога комплексу і падтрымальнай інфраструктуры, якая абароніць базу ад суровых умоў паверхні. Акрамя таго, CNSA правяло эксперымент па вырошчванні насення раслін, якія прыбылі на борце «Чан'э-4». Вядома, што бавоўна паспела даць усходы, перш чым халодная месяцавая ноч паклала канец эксперыменту. Тым не менш гэта першы вопыт вырошчвання раслін на спадарожніку і важны крок на шляху стварэння сельскагаспадарчай вытворчасці на месяцавай базе.

З усіх магчымых тэхналогій, здольных дапамагчы ў будаўніцтве месяцавай базы, найбольшыя перспектывы адкрывае 3D-друк. З яго дапамогай можна ствараць што заўгодна — ад найпрасцейшых прадметаў побыту, накшталт кубкаў, да запасных дэталяў для



станцыі. На Зямлі ўжо ствараюцца будынкі пры дапамозе 3D-друку, і будаўніцтва на Месяцы будзе адбывацца аналагічным чынам. Аднак 3D-друк у космасе — справа няпростая. Спатрэбяцца новыя тэхналогіі, якія змогуць працаваць ва ўмовах слабай гравітацыі Месяца. Трэба распрацаваць 3D-прынтары, здольныя фарміраваць дэталі ў касмічным вакууме.

«ВОДНАЯ ЛІХАМАНКА»

«Многія краіны ўдзельнічаюць у месяцавай праграме з вельмі далёкім прыцэлам на месяцавыя рэсурсы, — паведаміў «Інтэрфаксу» член-карэспандэнт РАН, навуковы кіраўнік Інстытута астраноміі Барыс Шустаў. — Гаворка ідзе не пра золата і не пра нафту з газам, а пра касмічныя рэсурсы. Усе празаічна: у кожным з гаджэтаў, напрыклад, шмат плаціны. А гаджэтаў толькі ў Расіі многія дзясяткі мільёнаў. У той жа час, па розных ацэнках, плаціны на Зямлі засталося на тэрмін ад 30 да 1000 гадоў. Калі браць песімістычную ацэнку — 30 гадоў, то ўжо цяпер трэба шукаць яе новыя крыніцы. А такога роду матэрыялы, як плаціна і іншыя, — прысутнічаюць у астэроідах. Мы можам выявіць іх у метэарытах, якія зваліліся на Зямлю. А на Месяцы іх калі не залежы, то па меншай меры вельмі шмат, там жа ніхто не займаўся іх здабычай. Значыць, праз некаторы час плаціну і іншыя матэрыялы будзе выгадна атрымліваць там. Вось адна з практычных мэт месяцавай гонкі».

Касмічныя дзяржавы, спакушаныя навуковымі і эканамічнымі перспектывамі, расштурхваюць адна адну локцямі ў ходзе новага імклівага наступу на Месяц, піша Le Figaro. Акрамя Еўропы, сваю праграму па завяванні Месяца, спыненую больш за сорак гадоў таму, аднавіла і Расія. Запуск касмічных апаратаў «Месяц-25», «Месяц-26» і «Месяц-27» можа быць ажыццёўлены ўжо ў найбліжэйшыя гады, адзначае Le Figaro. Японская кампанія iSpace плануе стварыць транспартную платформу Зямля — Месяц і правесці даследаванні вады, якая знаходзіцца ў цвёрдым стане ў кратарах на полюсах Месяца.

Амерыканцы, якія пры Абаме зрабілі сваёй прыярытэтнай задачай Марс, пераарыентавалі амбіцыі на наш зямны спадарожнік, адзначае Le Figaro. Нацыянальнае ўпраўленне па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы NASA ў канцы мінулага года абвясціла аб тым, што адбярэ дзевяць кампаній, з якімі абавязуецца супрацоўнічаць на працягу наступных дзесяці гадоў, згадваючы аб агульным пакеце фінансавых укладанняў у 2,6 мільярда долараў. Сярод іх буйныя карпарацыі, а таксама кампаніі-пачаткоўцы, якія прынялі ўдзел у конкурсе Google Lunar X Prize. Конкурс, які быў пачаты ў 2007-м, абяцаў прыз у 30 мільёнаў долараў той прыватнай камандзе, якая створыць месяцаход, здольны праехаць 500 метраў і адправіць фатаграфіі і відэаролікі пра свае подзвігі. Нягледзячы на адмену конкурсу ў студзені мінулага года з-за адсутнасці патэнцыйнага пераможцы, хоць крайні тэрмін быў працягнуты да 31 сакавіка, такія прыватныя кампаніі, як Moon Express і Astrobiotic, змогуць запусціць свой першы месяцаход ужо ў наступным годзе, піша Le Figaro.

Каланізацыя Месяца і космасу заўсёды была марай чалавецтва. Тэхналагічныя дасягненні і адкрыцці значнай крыніцы вады паблізу месяцавых полюсаў зрабілі яе больш прывабнай. «Месяц — гэта восьмы кантынент (мадэль з сямю кантынентамі — з падзеленай на Еўропу і Азію Еўразіяй — прынята часткова ў Заходняй Еўропе, у нас па традыцыі іх налічваюць шэсць, як і колькасць мацерыкоў. — **Аўт.)** у касмічным акіяне, першы востраў, які трэба будзе заваяваць, — лічыць Бернард Фойнг, дырэктар міжнароднай месяцавай групы, якая аб'ядноўвае чатырнаццаць агенцтваў, у тым ліку Еўрапейскае касмічнае агенцтва. — Спадарожнік нашай планеты з'яўляецца ідэальнай лабараторыяй для тэсціравання метадаў будаўніцтва або здабычы вады. У патэнцыяле гэта перадавая база: калі ўдасца выкарыстаць мільярды тон лёду, якія захоўваюцца ў яе нетрах, то яны могуць аказацца каштоўным рэсурсам для наступнага асваення Марса пры больш нізкіх выдатках».

Як заўважыў Барыс Шутаў, «самае галоўнае ў тым, што вада — гэта паліва для рухавікоў міжпланетных караблёў. Ці не сама вада, H_2O, вядома, а яе складнікі. Калі ў вас ёсць энергія (у космасе сонечная), ёсць час, вы раскладаеце ваду на вадарод і кісларод з дапамогай электролізу, з дапамогай сонечнай энергіі, і ў вас атрымліваецца два кампаненты — вадарод і кісларод. Пры злучэнні атрымаем магутны вадародны рухавік. Гэта лічыцца зараз асноўным фактарам для забеспячэння магчымасці распаўсюджвання чалавецтва па Сонечнай сістэме! Трэба паліва, а з сабой шмат паліва з Зямлі не возьмеш — гэта вельмі дорага. Ды да таго ж для такой аперацыі патрэбна гіганцкая канструкцыя. А вось калі навучыцца знаходзіць ваду ў космасе і выкарыстоўваць яе як паліва — гэта адзін з перспектыўных метадаў, якія цяпер распрацоўваюцца. Можна сказаць, што «залатая ліхаманка» ператвараецца ў «водную».

ПРАВА НА КОСМАС

У практычным сэнсе да 1969 года пытанне аб правах валодання тэрыторыямі Месяца і распрацоўкі яе нетраў было неактуальным, заўважае Бі-бі-сі. Але цяпер камерцыйная здабыча карысных выкапняў на спадарожніку Зямлі ўжо не здаецца фантастыкай з далёкай будучыні. У 1979-м у ААН было прынята Пагадненне аб дзейнасці дзяржаў на Месяцы і іншых нябесных целах, якое яшчэ называюць «Месяцавым пагадненнем». У ім абвяшчаецца прынцып выключна мірнага выкарыстання спадарожніка і падкрэсліваецца, што будаўніцтва і выбар размяшчэння месяцавых станцый неабходна ўзгадняць з ААН, растлумачыўшы пры гэтым прычыны іх узвядзення. У дакументе гаворыцца, што Месяц і яго карысныя выкапні з'яўляюцца агульным здабыткам усяго чалавецтва, а дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца «ўсталяваць міжнародны рэжым, уключаючы адпаведныя працэдуры, для рэгулявання эксплуатацыі прыродных рэсурсаў Месяца, калі будзе відавочна, што такая эксплуатацыя стане магчымай у найбліжэйшы час».

Галоўная праблема гэтага пагаднення ў тым, што яго ратыфікавалі толькі 11 краін. Сярод іх — Францыя і Індыя. Іншыя краіны з касмічнымі праграмамі, у ліку якіх Кітай, ЗША і Расія, дакумент не падпісалі. Таксама засталася ўбаку і Вялікабрытанія. Колішні галоўны рэдактар «Часопіса аб касмічным праве» Джаан Айрын Габрыновіч лічыць, што міжнародныя дагаворы нічога не гарантуюць. На іх выкананне ўплывае сумесь палітыкі, эканомікі і грамадскай думкі, сказала яна. У апошнія гады існуючыя пагадненні, якія забараняюць дзяржавам забіраць ва ўласнасць нябесныя целы, актыўна правяраюцца на трываласць.

У 2015 годзе ў ЗША быў прыняты закон аб канкурэнцыі ў пытанні камерцыйных касмічных запускаў, у якім гаворыцца аб праве грамадзян здабываць карысныя выкапні з астэроідаў. Ён не распаўсюджваецца на Месяц, але яго механізм дзеяння ў прынцыпе можа быць пашыраны. Адзін з заснавальнікаў кампаніі Planetary Resources Эрык Андэрсан назваў гэты закон самым вялікім у гісторыі прызнаннем права ўласнасці. У 2017 годзе аналагічны закон прынялі ў Люксембургу. У ім гаворыцца аб праве ўласнасці на рэсурсы, выяўленыя ў космасе. Намеснік прэм'ер-міністра краіны Эцьен Шнайдэр заўважыў, што дзякуючы гэтаму закону Люксембург стане еўрапейскім першапраходцам і лідарам у данай галіне.

У пакарэнні Сусвету агульны расклад відавочна змяняецца. Летась Кітай здзейсніў 39 касмічных запускаў — больш, чым любая іншая краіна. ЗША ў мінулым годзе ажыццявілі 34 запускі, а Расія — 20. Пры гэтым у 2016-м Злучаныя Штаты выдаткавалі на сваю касмічную праграму 36 млрд долараў, а КНР — каля $5 млрд. «Выкананне месяцавых даследчых місій прывяло да стварэння досыць добра развітой інфраструктуры для вывучэння далёкага космасу», — заўважыў намеснік кіраўніка Кітайскага нацыянальнага касмічнага ўпраўлення У Яньхуа. Першую місію на Марс КНР хоча адправіць налета ў ліпені, праз восем гадоў — даставіць адтуль узоры грунту. А да 2030-га мае намер дабрацца і да Юпітэра. І гэта найбліжэйшыя планы.

Захар БУРАК.

ЖАЛЕЗНАЯ ЛЭДЗІ ПАКАРАЕ СУСВЕТНЫ ТРЫЯТЛОН

Як беларуска стала першай жанчынай у СНД, якая трапіла на п'едэстал прэстыжнага Ironman у Барселоне

Ураджэнка Віцебска Ганна Максімава ў 2016 годзе ўзначаліла прэстыжны рэйтынг у сусветным трыятлоне і гучна заявіла пра сябе. Дыстанцыя гэтага віду спорту простаму абывацелю падасца вар'яцкай — 3,86 кіламетра ўплаў, 180,25 км — на ровары, 42,195 км — бягом. Элітныя трыятлеты трацяць на яе больш за восем з паловай гадзін. Сёння да іх смела можна аднесці і беларуску. Але перш чым выйсці на дыстанцыю, каб змагацца з саперніцамі, Ганне давялося «паваяваць» з урачамі: у дзяўчыны выявілі праблемы з сэрцам і настойвалі на тым, каб выключыць прафесійны спорт з жыцця. Аднак у Ганны іншыя планы: самы прэстыжны чэмпіянат свету на Гаваях, перамога ў Ironman і Алімпіяда-2020.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«You are ironman»

— Ганна, вы памятаеце свае першыя спаборніцтвы?

— Вядома, гэта незабыўна. Лічу, што першы старт — адзін з галоўных у кар'еры, ён дае штуршок для развіцця ў спорце і нараджае жаданне выступаць. Мае першыя спаборніцтвы праходзілі ў Драгічыне (Брэсцкая вобласць), я выступала ў дуатлоне і заваявала свой першы медаль, гэта была «бронза». Цяпер там кожны год праходзяць спаборніцтвы, і я стараюся прыязджаць. З дзяўчатамі спаборнічаць не магу, бо пакуль яны не дацягваюць да майго ўзроўню, таму проста праводжу там хуткасную падрыхтоўку.

А наогул, з дзяцінства я хацела займацца гімнастыкай, але перад першай трэніроўкай зламала палец, з гіпсам на заняткі не пайшла. Праз пару гадоў настаўнік фізкультуры даў заданне — прабегчы 10 кругоў па стадыёне без адпачынку. Я справілася, а ён заўважыў, што ў мяне добрая цягавітасць, і прапанаваў паспрабаваць сябе ў трыятлоне. Тады я слаба ўяўляла, што гэта. Сказалі, будзеш плаваць і бегаць.

— Дарослыя вынікі вы пачалі паказваць ужо ў 2016-м, у 22 гады?

— Хутчэй нават у 2015-м, калі стала сёмай на чэмпіянаце свету на доўгай дыстанцыі. З гэтага і пачаўся мой шлях у трыятлоне. Калі браць алімпійскую сістэму, то я ўжо пяць гадоў выступаю за нашу краіну на міжнароднай арэне і спрабую заваёўваць ачкі для адбору на Алімпійскія гульні.

— Восенню 2018-га вы сталі сярэбраным прызёрам прэстыжнага турніру Ironman, гэтага не ўдавалася нікому з краін СНД...

— Ды і часу такога ніхто яшчэ не паказваў (9 гадзін 8 хвілін 17 секунд). Ад сябе такога выніку я таксама не чакала, хоць, вядома, хацела трапіць у тройку. Па ходзе гонкі ў мяне добра склалася ў бегу, пачала абганяць многіх дзяўчат і ў выніку выбегла на другое месца.

— Ironman — гэта самыя прэстыжныя спаборніцтвы ў трыятлоне?

— У Ironman вельмі шмат стартаў, дзесьці каля 40, у Еўропе праходзіць 15—20 з іх, астатнія раскіданыя па Амерыцы, Аўстраліі, Азіі, Афрыцы. Ёсць розныя серыі: поўны Ironman і 70.3 (гэта паўайранмен). Самым прэстыжным лічыцца, вядома, поўны: калі ты ўклаўся ў ліміт часу, то лічышся жалезным чалавекам. Кожны, хто дасягае фінішу, чуе словы каментатара: «You are iron man», што значыць «Ты — жалезны чалавек».

— І як вы адчуваеце сябе ў гэтай ролі?

— Жалеза ўва мне няма, вядома, але мне прыемна *(усміхаецца)*.

Гэты год скіраваны на адбор на Алімпіяду

— Чэмпіянаты свету і Еўропы важныя для прафесійных спартсменаў у трыятлоне?

— Ёсць чэмпіянат Еўропы на доўгія дыстанцыі, напрыклад, у 2017 годзе я заняла там трэцяе месца, гэта дакладна такая ж дыстанцыя, як Ironman. Таксама праходзяць чэмпіянаты свету. Яны важныя для спартсменаў, ды і балельшчыкаў там таксама хапае, хоць, напэўна, не так шмат, як на Ironman. Для прафесійнага атлета, які знаходзіцца ў алімпійскім руху, чэмпіянат Еўропы і свету — гэта галоўнае, але, напрыклад, для асабістага развіцця, ужо пасля алімпійскага цыкла, Ironman больш круты. Многія ўдзельнікі Алімпіяд пераадольваюць палоўкі (скарочаная дыстанцыя паўайранмена).

— На якія прызавыя можна разлічваць, удзельнічаючы ў Ironman?

— Гэта залежыць ад арганізатараў, ад таго, колькі чалавек прымае ўдзел у турніры, наколькі моцная канкурэнцыя, якая траса. Памятаю, што ў Барселоне за першае месца давалася 6 тысяч долараў, 4 тысячы — за другое і 3 — за трэцяе. Самыя вялікія прызавыя — на чэмпіянаце свету на Гаваях. Удзельнічаць у гэтых спаборніцтвах вельмі прэстыжна, заявіцца туды можа далёка не кожны, трэба прайсці пэўны адбор на стартах Ironman. Калі ты заваяваў 1-2 месца, то можаш атрымаць права ўдзельнічаць у чэмпіянаце на Гаваях. У мяне таксама ёсць такая мэта, але не ў гэтым годзе. Гэты год скіраваны на адбор на Алімпіяду-2020.

— Ведаю, што трапіць туды таксама вельмі складана.

— Самыя вялікія ачкі для адбору можна зарабіць на этапах Кубка свету, але, на жаль, большасць з іх праходзіць на розных кантынентах, у Еўропе звычайна такія толькі два старты — у Германіі і Англіі, сёлета дадаецца яшчэ некалькі этапаў Кубка свету на нашым кантыненце. Мы не можам па фінансаванні выехаць у Амерыку ці Канаду, таму пакуль даводзіцца ездзіць толькі на этапы Кубка Еўропы і імкнуцца заваёўваць ачкі там. Спадзяюся, сёлета на адзінадва сусветныя этапы мяне звозяць і я зараблю значна больш ачкоў, таму што каэфіцыент на сусветных этапах значна вышэйшы.

— Што для вас асабіста выйграць было б важней: Алімпіяду або Ironman?

— Гэта дзве мае запаветныя мары, мэты, якіх імкнуся дасягнуць. Спачатку хачу рэалізаваць адну, потым наступную. Часу яшчэ досыць, самы добры ўзрост для нашага віду спорту — 30—35 гадоў.

Сціскаю зубы і іду да мэты

— Трыятлон уключае бег, плаванне і язду на ровары. Што даецца найбольш складана?

— Адназначна плаванне. Над ім трэба вельмі шмат працаваць. Паляпшэнне вынікаў прыходзіць вельмі павольна. Зараз я раблю велізарны аб'ём работы, цяжка, але я сціскаю зубы і іду да мэты. Каб нешта давалася лёгка, такога няма. Больш за ўсё падабаецца бег — там можна бачыць свой прагрэс.

— Падчас спаборніцтваў вы плывяце ў натуральных вадаёмах. Гэта дадае складанасці?

— Прыродныя ўмовы адыгрываюць вялікую ролю: тэмпература вады, мора гэта ці возера, хвалі. І тыя, хто з табой стартуе, — таксама немалаважны фактар. Стартуюць адразу каля 50 чалавек, бягуць у ваду натоўпам. Гэта вельмі крута, але ў той жа час небяспечна, у натоўпе бываюць невялікія сутычкі. Прылятае рукой, локцем, пяткай, але ўсе лічаць гэта нармальным. Калі я адпачываю на моры, то ніколі не буду заплываць далёка — баюся, але калі на спаборніцтвах, мне значна спакайней, ведаю: калі што — мне дапамогуць.

— На ровары вы пераадольваеце велізарныя адлегласці...

— Гэта самы доўгі від, на які аддаеш вельмі шмат часу. На спаборніцтвах ён праходзіць хутка, бывае, едзеш на раўне з машынамі, вадзіцелі так дзівяцца. А вось на трэніроўках выкатаць такую колькасць кіламетраў адной складана.

— Атрымліваецца, адна з асноўных якасцяў трыятлета — цягавітасць, яна ў вас прыроджаная?

— Можа быць, але ў любым выпадку яе трэба ўмацоўваць, развіваць і фарміраваць. Проста так нічога не даецца.

— Гонка доўжыцца больш за восем гадзін. Што трэба прадугледзець спартсмену на гэты час?

— Пытанні харчавання, адзення, такія дробязі, як прысыпка ў красоўкі, каб не нацерці мазалі. Гэтыя нюансы вельмі важныя. Менавіта з іх складаецца поспех. Найменшы нюанс можа згуляць вялікую ролю. Абавязкова з сабой на спаборніцтвы прывожу наш беларускі зефір (у Еўропе яго не знайсці). Ён смачны, жуецца лёгка, гэта важна падчас гонкі, таму што сківіца ўжо не так добра працуе, плюс табе трэба канцэнтравацца на дыханні, а падчас ежы яно збіваецца. Важна есці тое, што хутка засвойваецца і хутка дае энергію. Зефір для мяне ідэальны прадукт.

— Падчас доўгага бегу або працяглай язды на веласіпедзе ёсць такі момант, калі арганізм адмаўляецца працаваць, і гэтую кропку трэба перажыць, каб адкрылася другое дыханне. Як вы з гэтым спраўляецеся?

— У думках імкнуся сябе падбадзёрваць рознымі матывацыйнымі словамі. Трэнер, калі прабягаю міма яго, таксама падбадзёрвае, просіць пацярпець, кажа, што хутка стане лягчэй. Сама думка пра тое, што я хачу перамагчы, рухае наперад, таму маральна спрабую перадужаць сябе. Спрацоўвае.

— У вас былі праблемы са здароўем, але вас гэта не спыніла...

— Так, былі выяўлены праблемы з сэрцам, але я ведаю свой арганізм, разумею: калі б мне было сапраўды дрэнна, то гэта адбівалася б на трэніроўках і спаборніцтвах, я б проста не змагла вытрымліваць такую нагрузку. Таму ўсяляк старалася даказаць дактарам, што магу займацца спортам прафесійна, праходзіла розныя тэсты. У выніку мне далі допуск, але цяпер я праходжу абследаванне часцей, чым іншыя спартсмены. Калі звычайна гэта адбываецца два разы на год, то я праходжу разы чатыры, каб урачы маглі кантраляваць мой стан, каб ім і мне было спакайней.

Нас у сям'і пяцёра

— Вы выраслі ў шматдзетнай сям'і. Як правіла, такія дзеці заўсёды дамагаюцца больш высокіх вынікаў, згодны?

— Хутчэй за ўсё, так. Такія дзеці больш працавітыя, мэтанакіраваныя, таму што яны разумеюць, што і якой цаной дастаецца.

У нас у сям'і пяцёра дзяцей, зараз я ўсяляк імкнуся дапамагаць маме з кватэрай, рамонтам. А яны ў сваю чаргу ганарацца маімі поспехамі.

— У якія моманты жалезны чалавек можа правіць слабасць?

— Жаданне, каб мяне пашкадавалі, узнікае толькі на трэніроўках. Сентыментальнай магу быць у момантах, якія датычацца сям'і, гэта для мяне святое. Дарэчы, сваёй другой сям'ёй лічу трэнера і тых, з кім выраслі на трэніроўках.

— Калі апошні раз вас штосьці кранала?

— Нядаўна. Мой хатні гадаванец. Ён прыносіць мне ў ложак цацкі, мы з імі спім. І вось прыходжу з трэніроўкі, а ён так пакусаў мае штаны, што там утварыліся дзіркі. Здаецца, і насварыцца хачу, але сабака так глядзіць на мяне, што нічога не магу зрабіць, прыйдзецца купіць новыя.

— Ці атрымліваецца знайсці час на дзявочыя патрэбы?

— Па салонах асабліва не хаджу, адзінае, што раблю, — гэта пазногці. А ў вольны час больш люблю сустрэцца з сябрамі, пагуляць у мафію па спартыўных правілах. Гэтая гульня вельмі добра развівае не толькі інтэлект, але і псіхалогію, уважлівасць да іншых.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
г. Віцебск.

ЗАО «Белреализация» организатор торгов уведомляет, в извещение, опубликованное в газете «Звязда» № 15 от 24.01.2019 г., о проведении повторных публичных торгов в электронной форме по продаже имущества ОАО «Гомельгазстрой», назначенных на 7 февраля 2019 г. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY, вносятся следующие изменения

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
62	Прицеп тракторный 2 ПТС 6,5, инв. № 040689, рег. знак ЕВ-3 5958, г. в. 2011, зав. № 0289. Вагон-бытовка, инв. № 010692	1 944,00	97,20	194,40
63	Прицеп тракторный 2 ПТС 6,5, инв. № 040690, рег. знак ЕВ-3 5956, г. в. 2011, зав. № 0291	2 592,00	129,60	259,20
64	Прицеп тракторный 2 ПТС 6,5, инв. № 040691, рег. знак ЕВ-3 5957, г. в. 2011, зав. № 0290. Вагон-бытовка, инв. № 010693	1 944,00	97,20	194,40
65	Прицеп тракторный 2 ПТС 4,5, инв. № 040638, рег. знак МЖ 5957, г. в. 2008, зав. № 4448	1 656,00	82,80	165,60
66	Шасси трактора, инв. № 090563, не зарегистрирован. Вагон-бытовка, инв. № 010688	1 944,00	97,20	194,40
67	Экскаватор Hitachi EX-120, инв. № 050552, рег. знак ЕА-3 7683, г. в. 1997, зав. № 12N32746	15 120,00	756,00	1 512,00
68	Экскаватор «Амкодор» 702 ЕВМ-01, инв. № 040892, рег. знак ЕК-3 1527, г. в. 2014, зав. № Y3A702EBM109140042	20 160,00	1 008,00	2 016,00
69	Экскаватор одноковшовый пневмоколесный ЕВ-К-14, инв. № 040634, рег. знак ЕВ-3 2657, г. в. 2009, зав. № Y39EBK14090006006	17 280,00	864,00	1 728,00
70	Экскаватор ЭО 4321, инв. № 050436, рег. знак ЕА 4776, г. в. 1993, зав. № 2176	4 464,00	223,20	446,40
71	Экскаватор ЭО-3123-20, инв. № 040808, транспортное средство без регистрации	3 384,00	169,20	338,40
72	Экскаватор-погрузчик ДЭМ-1142, инв. № 050541, рег. знак ЕА 4763, г. в. 2006, зав. № 155	17 280,00	864,00	1 728,00
73	Экскаватор-погрузчик ДЭМ-1142, инв. № 040666, рег. знак ЕВ-3 3824, г. в. 2010, зав. № 744	12 960,00	648,00	1 296,00
74	Экскаватор-погрузчик ДЭМ-1143, инв. № 050546, рег. знак ЕА-3 7653, г. в. 2006, зав. № 173	11 520,00	576,00	1 152,00
75	Экскаватор-погрузчик ЭП-Ф-П.1, инв. № 040642, рег. знак ЕВ-3 2693, г. в. 2009, зав. № 164	13 680,00	684,00	1 368,00
76	Автобус вахтовый инв. № 050824, GAZ-6611 VM2001, рег. знак АК 3814-3, г. в. 1992, зав. № XTH006611N0700196	1 512,00	75,60	151,20
77	Автомобиль УРАЛ-4320 ПВ/плет, инв. № 090564, рег. знак ЕМ 2682, г. в. 1991, кузов № 170449	9 360,00	468,00	936,00
78	Автомобиль ГАЗ-5312, инв. № 050817, рег. знак АК 3186-3, г. в. не определен, кузов б/н	1 008,00	50,40	100,80
79	Автомобиль ГАЗ-5312, инв. № 050818, STZM 3903, рег. знак АЕ 6102-3, г. в. не определен, кузов № 284 XTH531200K1155048	1 008,00	50,40	100,80
80	Автомобиль МАЗ 533710 29, инв. № 050815, рег. знак АА 0426-3, г. в. 1992, кузов № XTM533710N00010302	2 088,00	104,40	208,80
81	Автомобиль МАЗ 5433А2, инв. № 050623, рег. знак АК 9297-3, г. в. 2009, кузов № Y3M5433A290000190	6 192,00	309,60	619,20
82	Автомобиль МАЗ 642205 MAZ 6422 05-220, инв. № 050828, рег. знак АВ 0661-3, г. в. 2007, кузов № Y3M64220570002439	10 080,00	504,00	1 008,00
83	Автомобиль Саманд ЛХ, инв. № 050830, рег. знак 3323 ВХ-3, г. в.2009, кузов Y3W2PSMLX9FNX0794	4 176,00	208,80	417,60
84	Автомобиль УАЗ 3909 (на базе 3343), инв. № 090571, рег. знак АВ 6135-3, г. в. не определен, кузов № 39090070111916	1 584,00	79,20	158,40
85	Автомобиль УАЗ 2206 02, инв. № 050821, рег. знак АК 3815-3, г. в. 2004, кузов № 22060040203525 XTT22060240483121	1 584,00	79,20	158,40
86	Автомобиль УАЗ 390944, инв. № 050829, рег. знак АК 3816-3, г. в. 2007, кузов № 39094070122746 XTT39094480424900	2 592,00	129,60	259,20
87	ВАХТОВАЯ машина ГАЗ 66 ВМ 2001, инв. № 090565, рег. знак ЕС 4607, г. в. 1990, кузов № XTH006614L0647324	1 512,00	75,60	151,20
